ПАДРАБЯЗНАСЦІ СМЯРОТНАГА ДТЗ ПАД СМАЛЯВІЧАМІ 3

ХТО ВЫБІРАЕ МЕДЫЦЫНУ? 7

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

8 ЖНІЎНЯ 2023 г. АЎТОРАК № 151 (30031)

КАРАТКА

- Аляксандр Лукашэнка зацвердзіў эмблему і сцяг МУС.
- **Залатавалютныя рэзервы Беларусі за ліпень выраслі амаль да $8 млрд.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Валерый БЕЛЬСКІ, нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі:

«Мы лічым найважнейшай задачай аб'яднанне сусветнай супольнасці для рэалізацыі Мэт устойлівага развіцця як асновы ўсеагульнага прагрэсу і росквіту, нягледзячы на прафанацыю і дыскрэдытацыю гэтай работы з боку асобных краін, якія адыгрываюць значную ролю ў міжнародных адносінах. Бо нашы каштоўнасці не дазваляюць заставацца абыякавымі да бед і пакут людзей, пазбаўленых часта самага неабходнага — ежы, прытулку, сучаснай медыцынскай дапамогі, абароны ад гвалту ў любых яго формах, асабліва ў адносінах да дзяцей. Беларускі народ заплаціў за мір і дабрабыт вялікую, страшную цану, выпрацаваў імунітэт да несправядлівасці і дыктату. Разлічваем, што наш голас, галасы іншых народаў Зямлі будуць нарэшце пачутыя і ўладныя людзі ў сваіх дзеяннях замест задавальнення карыслівых інтарэсаў пад прыкрыццём глабальнага парадку дня аддадуць перавагу элементарнай прыстойнасці і адказным паводзінам у дасягненні Мэт устойлівага развіцця».

ISSN 1990 — 763X

«МОЦНЫ ХАРАКТАР — ЯРКАЯ ГУЛЬНЯ!»

ГЭТА НЕ ТОЛЬКІ ПРА СПОРТ. ГЭТА ПРА КОЖНАГА З НАС»

Фота БелТА.

Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

Выступленне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на ўрачыстай цырымоніі адкрыцця II Гульняў краін СНД

Дарагія сябры!

Паважаныя атлеты, трэнеры, суддзі, арганізатары і, вядома ж, гледачы!

Я вітаю ўсіх, хто знаходзіцца тут, на «Мінск-Арэне». Усіх, хто сочыць за цырымоніяй адкрыцця анлайн.

Беларуская зямля прымае Гульні краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

Зноў да нас прыкавана ўвага мільёнаў балельшчыкаў ва ўсім свеце. Гэтак жа, як і чатыры гады таму, калі на нашых стадыёнах гучалі пераможныя фанфары Другіх Еўрапейскіх гульняў.

Іх агонь, запалены ў Мінску, не згас. Ён гарыць верай у алімпійскія ідэалы, сапраўдную справядлівасць і спартыўнае братэрства. Ён аб'ядноўвае шчырых сяброў, верных і надзейных, — людзей з жалезным характарам.

Ён сабраў нас разам.

Тут пануе цудоўная атмасфера. Вы ствараеце яе сваімі эмоцыямі, адкрытасцю, дружалюбнасцю.

Дзякуй вам вялікі.

Удзячны кіраўніцтву краін — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Усіх краін, якія прыехалі да нас. Вы аказалі Беларусі давер, і мы дастойна правядзём гэты спартыўны форум. У яго вялікая будучыня.

І гэта будучыня ў нашых руках. Як бы ні імкнуліся яе адабраць сусветныя заправілы — азлобленыя і бяссільныя. Перакананы, яны нас таксама сёння бачаць.

Глядзіце, слухайце, рабіце высновы.

Вы спрабуеце выкрасліць моцных канкурэнтаў з міжнароднага спорту.

Вы хочаце адабраць нашы спартыўныя перамогі.

Вы знішчаеце дух і сэнс алімпійскага руху.

Гэта прыкмета слабасці і вашага страху.

Гэта спроба схавацца за жалезнай заслонай ад праўды жыцця.

Вы спрабуеце схавацца ад праўды жыцця. Гэта прызнанне сілы нашых глыбінных каштоўнасцей, якія падзяляе пераважная большасць людзей на планеце, у тым ліку звычайныя, простыя еўрапейцы і амерыканцы.

Паглядзіце. Тут сабраліся тысячы. Трансляцыю глядзяць мільёны.

Усе ўбачаць не толькі нашу выдатную Беларусь, але і культуру тых дваццаці краін, якія прадстаўлены вядучымі спартсменамі. Вы ўбачыце традыцыі, вы ўбачыце гераічную гісторыю Беларусі, якая характэрна для ўсіх краін Садружнасці. Вы пераканаецеся, што Беларусь мае цудоўную, чароўную прыроду.

Усе ўбачаць сучасныя арэны, моцных атлетаў, яркія паядынкі і новыя рэкорды, а галоўнае — вялікую міжнародную цікавасць да гэтых Гульняў.

Да нас прыехалі звыш дзвюх тысяч спартсменаў з больш як дваццаці краін розных кантынентаў.

Ніякія санкцыі, ніякія палітычныя інтрыгі не пазбавяць нас гэтага свята. Гэта немагчыма. Свет цесны, узаемазалежны, узаемаўвязаны. І толькі безразважныя спрабуюць разарваць гэтыя сувязі.

Дарагія сябры!

Я ўпэўнены, нашым гасцям будзе цёпла, утульна і, самае галоўнае, спакойна, душэўна спакойна на беларускай зямлі.

Мы зрабілі і будзем рабіць усё для гэтага. І для таго, каб Гульні краін Садружнасці сталі сапраўдным сімвалам дружбы, міру і стваральнай працы.

Дэвіз нашых Гульняў — «Моцны характар — яркая гульня!». Гэта не толькі пра спорт. Гэта пра кожнага з нас.

Настаў час мужных і рашучых людзей, людзей, здольных пастаяць за гонар краіны, за перамогі сваіх бацькоў і будучыню сваіх дзяцей. Гэта — наш час.

Жадаю ўсім спартсменам — удзельнікам Гульняў удачы і вялікіх асабістых дасягненняў. Вам хачу сказаць: спартсмены, не перажывайце. Нас немагчыма — ні расіян, ні беларусаў, іншых — выкрасліць з міжнароднага алімпійскага і спартыўнага руху. Вы заўсёды будзеце запатрабаваны. Вы заўсёды будзеце ў справе.

Трэнерам — мудрасці і цярпення.

Балельшчыкам — яркага відовішча, незабыўных уражанняў і вялікага мора пазітыўных эмоцый.

Аб'яўляю Другія Гульні краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў адкрытымі!

Жніво-2023

Дзеля хлеба на стале

У аграрыяў паўночнага рэгіёна — гарачая пара: штодзень ад відна да відна шчыруюць на залатых нівах механізатары, каб забраць як мага больш хлебных каласоў. На ўчарашнюю раніцу на Віцебшчыне было ўбрана 34 працэнты плошчаў. Віцебскаму раёну сёлета трэба апрацаваць каля 23 тысяч гектараў збожжавых культур. Штодзень хлебаробы Падзвіння абмалочваюць тысячу гектараў. Кожны з камбайнераў імкнецца паставіць новы асабісты жніўны рэкорд, спаборнічаючы з капрызамі надвор'я ва ўпартасці. Сярод тых, для каго кожная ўборачная — своеасаблівы зорны час, — малады механізатар агракомплексу «Янавічы» ААТ «Віцебская бройлерная птушкафабрыка» Яўген КУХАРАЎ. Слава аб намалотах 28-гадовага хлопца штогод гучыць не толькі на Віцебшчыне, але і ў краіне.

Сем гадзін раніцы, дзе-нідзе над вёскай плыве шызы ранішні туман, стракочуць абуджаныя сонцам птушкі. А на мехдвары сярод шэрагу сельгасмашын ужо рвецца ў бой жоўты New Holland пад надзейным кіраўніцтвам Жэні. Для яго, прызнаецца хлопец, такі распарадак дня — «кветачкі», зімой даводзіцца ўставаць а палове трэцяй ночы. Кожны дзень на мехдвары пачынаецца з візуальнага агляду тэхнікі на наяўнасць пашкоджанняў, прыборкі (прычым бункер камбайна можна прыбіраць толькі напорам паветра) і запраўкі — на дзень 18-тоннай машыне патрэбна каля 400 літраў паліва. А далей, ухапіўшы працоўны настрой і адрас поля, можна накіроўвацца ў новы ўборачны дзень.

Яўген родам з вёскі Янавічы, дзе і працуе ўжо 11-ы год. Абраўшы ўслед за бацькам нялёгкую сцяжыну сельскай гаспадаркі, ён дзень за днём упэўніваецца ў правільнасці прынцыпу «дзе нарадзіўся — там і згадзіўся» і расказвае, што ніколі не думаў з'ехаць у горад у пошуках лепшай долі. «За ўсе гады незалежна ад сезона не было такога дня, каб мне сказалі, што няма работы. Летам — на камбайне, зімой — на «Амкадоры». У гэтым руху мне, вяскоўцу, спакойна», — дзеліцца Кухараў.

Профільнай адукацыі ў маладога механізатара няма: пасля школы была армія, а потым карцела ўжо хутчэй на тэхніку. З ёй, асабліва з вялікімі машынамі, хлопец на «ты» з самага дзяцінства: часта дапамагаў бацьку Мікалаю Браніслававічу, які больш за 20 гадоў аддаў сельскай гаспадарцы і працуе дагэтуль.

Як прыйшоў з арміі, купіў свой трактар і прычапныя агрэгаты — гэта ў вёсцы пастаянны заробак, калі рукі адкуль трэба растуць. А ў мясцовую гаспадарку прыйшоў у 2012 годзе, адразу пасля апошняга званка — пакуль аднакласнікі рыхтаваліся да ЦТ, Жэня пачаў сваю працоўную біяграфію. Калектыў юнака прыняў адразу. Побач было надзейнае плячо брата і бацькі. Першы трактар ад Мікалая Браніслававіча перайшоў сыну. Цяпер у 28-гадовага вопытнага і апантанага Кухарава не саромеюцца папрасіць парады і дапамогі дарослыя калегі.

Першую хлебную вяршыню Яўген узяў разам з бацькам у складзе сямейнага экіпажа яшчэ ў юнацтве, а ў 2017 годзе ён першы на Віцебшчыне намалаціў тысячу тон золата палёў. За ёй былі і другая, і трэцяя тысячы, а летась камбайнер дасягнуў мяжы ў чатыры тысячы тон. «У мінулым сезоне, калі вобласць намалаціла звыш мільёна, стаяла надзвычай лагоднае надвор'е і ўраджайнасць радавала. Малацілі без перапынку, нават абедалі ў кабіне. Гэтае адчуванне энтузіязму і адрэналіну не перадаць словамі», — дзеліцца хлопец. За высокія вынікі — вялікая ўзнагарода, летась на жніве атрымалася зарабіць каля 10 тысяч рублёў. Фіксаванага акладу на ўборачнай няма, што намалаціў — тое і атрымаў. Пры добрай ураджайнасці дзень

камбайнера каштуе каля 200 рублёў, а Жэня атрымліваў і па 500, але тады літаральна перастаралі дзейнічаць ногі і рукі.

Аўтарытэт, які хлопец заслужыў у кіраўніцтва агракомплексу, пацвярджаны і тым, што першы свой уборачны сезон ён правёў на новым беларускім камбайне. А пасля, гледзячы на адказнасць і пільны догляд за тэхнікай, яму даверылі імпартны New Holland, на якім працуе ўжо пяты год. Яго 8-тонны бункер Кухараў запаўняе за 15 хвілін пры сярэдняй ураджайнасці, за 10 — пры высокай. Пакуль зробіць круг па полі — ужо чакае машына, каб шпарка, але акуратна даставіць кожнае зярнятка ў зернесховішча. «На мінулым жніве працавалі на двух камбайнах з братам, МАЗы не паспявалі вяртацца. Адным словам, мы нашым працоўным запалам і хлопцам-кіроўцам не давалі перадыху», — усміхаецца механізатар. Ён спадзяецца, што і гэты сезон будзе не горшы. Дарэчы, Жэня — не адзіны малады перадавік у «Янавічах». Разам з кіроўцам Дзмітрыем Іванovым яны задаюць тон усяму жніву ў раёне — летась іх маладзёжны экіпаж паказаў найвышэйшы вынік па намалоце і адвозцы ў краіне сярод сваёй узроставай катэгорыі. Для іх, сціплых і працавітых сельскіх жыхароў, чарговыя ўшанаванні на абласных «Дажынках» — не прывычка, а радасць за прызнанне і падзяка за нялёгкую працу хлебаробаў.

Пакуль рухаемся па полі з азімай пшаніцай, назіраю за тым, як віртуозна Яўген чапляе самыя маленькія каласкі ў цяжкадаступных месцах. Мо аграном можа паскардзіцца кіраўніцтву на няякаснае жніво? Усё аказалася прасцей: шанаваць працу сваіх калег у агракомплексе заведзена здаўна, таму і вынікі маюць высокія. «Я ж і сам калісьці падрыхтоўваў глебу, сеяў. Калі пакідаць на полі хлеб, тады навошта ўвесь напружаны год?» — пагаспадарску разважае Жэня. З гэтай жа прычыны і затрымліваецца малады механізатар на ніве да позняга вечара — добра, што ілюмінацыя ў камбайна адменная. І кандыцыянер у кабіне ёсць, і можна пры добрых умовах нават круіз-кантроль паставіць.

Але і па-за межамі палёў у Кухарава шмат клопату: цяпер ён будуе свой дом. У гарачыя дні жніва сям'я Жэні амаль не бачыць яго, аднак жонка Марыя ведае, дзеля чаго. Яна і двухгадовы сынок Давід з'яўляюцца для маладога чалавека крыніцай цеплыні і радасці, спакою пасля цяжкага дня. Марыя працуе ў агракомплексе ветурачом, сельская гаспадарка для Яўгена стала вызначальнай і ў каханні. Поруч яны ўжо тры гады падтрымліваюць адно аднаго і ў прафесіі, і дома. Калі выдаецца вольная хвіліна, хлопец любіць пасядзець з вудай на возеры, аднак такіх у вірлівым коле вясковага жыцця бывае няшмат. Скончыцца сезон — будзе спакайней, аднак і на «Амкадоры» хапае абавязкаў: падрыхтоўка траншэй, адвоз кармоў.

Я развітваюся з Жэнем, пажадаўшы новых тысячных вяршынь і добрага надвор'я. Жоўты New Holland пераязджае на новае поле, а я радуюся, што калі ў новага пакалення ёсць такія прыклады адданасці сваёй справе, ёсць упэўненасць у будучыні.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

У адкрытым фармаце

У штаб-кватэры Нацыянальнага алімпійскага камітэта Рэспублікі Беларусь прайшло пасяджэнне савета па фізічнай культуры і спорце ўдзельнікаў Пагаднення аб супрацоўніцтве ў галіне фізічнай культуры і спорту дзяржаў СНД. Яго галоўнай тэмай стала супрацоўніцтва ў спартыўнай сферы на прасторы Садружнасці Незалежных Дзяржаў.

А яно Гульнямі краін СНД не абмяжоўваецца. Адпрацоўваецца пытанне аб правядзенні Кубкаў краін СНД па асобных відах спорту, спаборніцтвы сярод студэнтаў. На апошнім пасяджэнні кіраўнікоў урадаў краін — удзельніц СНД абмяркоўвалася правядзенне спартакіяды сярод дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Як расказаў журналістам **намеснік генеральнага сакратара СНД Леанід АНФІМАЎ**, плануецца пашыраць каляндар спаборніцтваў па асобных відах спорту. Паколькі Гульні краін СНД праводзяцца раз у два гады, правядзенне такіх спаборніцтваў дасць магчымасць запоўніць спартыўны каляндар на прасторы СНД.

Сёння на ўсіх спартыўных нарадах і пасяджэннях у паветры лунае тэма санкцый у дачыненні да беларускага і расійскага спорту. «Той факт, што ў II Гульнях краін СНД удзельнічаюць 20 краін, гаворыць аб тым, што ізаляцыя не адбылася і блакада прарваная ўдзелам спартсменаў у Гульнях, — сказаў Леанід Анфімаў. — І гэта першая ластаўка, якая пацвярджае, што Беларусь і Расія не апынуліся ў ізаляцыі і прызнаныя міжнароднай супольнасцю. Каб гэта паказаць, неабавязкова рабіць гучныя заявы. Удзел краін СНД у спартыўных Гульнях і ёсць таму пацвярджэнне. Калі мы рыхтаваліся да Гульняў, галоўнай асцярогай было не тое, як мы правядзём гэты форум, а ці не будзе ціск, які аказваецца на Беларусь і Расію, кіраўніцтвам да дзеяння для краін СНД. Сапраўды, мы асцерагаліся, што многія краіны не выставяць каманды. Але гэтага не адбылося. І правядзенне Гульняў краін СНД у такім фармаце, які мы сёння бачым, лішні раз даказала, што патугі нашых нядобразычліўцаў не адбыліся».

Намеснік генеральнага сакратара СНД расказаў, што рашэнне аб адкрытым фармаце Гульняў было прынята, калі распрацоўваўся рэгламент яшчэ падчас падрыхтоўкі да I Гульняў, якія прайшлі ў 2021 годзе ў Казані. Але ўжо тады было падкрэслена, што Гульні краін СНД ні ў якім разе не павінны стаць заменай Алімпійскім гульням. «Добрая воля савета і ўсіх краін — удзельніц СНД, структур, што задзейнічаны ў арганізацыі Гульняў, дала свой плён — і ў Беларусь прыехала больш за дзесяць краін, якія не з'яўляюцца ўдзельніцамі Садружнасці. І гэта будзе сігналам і для іншых краін, стымулам паўдзельнічаць у наступных Гульнях краін СНД у Азербайджане», — дадаў Леанід Анфімаў.

Намеснік міністра спорту Азербайджана Мар'яна ВАСІЛЬЕВА пацвердзіла, што III Гульні краін СНД, якія пройдуць у 2025 годзе ў Азербайджане, будуць мець адкрыты фармат. «Нізкі паклон беларускім калегам за такі высокі ўзровень арганізацыі Гульняў. Мы ведалі, што беларусы — вельмі гасцінны народ, і на Гульнях мы яшчэ раз у гэтым упэўніліся. Ідэя Гульняў краін СНД у тым, што гэта Гульні ў першую чаргу для маладых спартсменаў. Але мы ўбачылі невялікую змену ў фармаце і, магчыма, мы таксама будзем пераймать гэты досвед і даваць удзельнічаць у Гульнях і дарослым спартсменам. Трэція Гульні краін СНД пройдуць у горадзе Гянджа, гэта другі па велічыні горад пасля сталіцы Баку, там будуецца новы спартыўны комплекс. Нам вельмі спадабалася ідэя аб правядзенні спаборніцтваў у рэгіёнах, і мы таксама будзем тое працягваць», — расказала яна.

Па словах **Аляксея МАРОЗАВА, намесніка міністра спорту Расійскай Федэрацыі**, для расійскіх спартсменаў II Гульні краін СНД — вельмі важны этап. Асабліва для лёгкаатлетаў, якія амаль сем гадоў не ўдзельнічалі ў буйных міжнародных стартах. «У многіх дысцыплінах змяніліся пакаленні, і для маладых спартсменаў гэта першая буйная спартыўная падзея. Для іх гэта вельмі ганаровы і вельмі важны старт», — сказаў ён.

Першы намеснік міністра спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Аляксандр ДАРАХОВІЧ падкрэсліў, што для арганізатараў самае галоўнае, каб кожны, хто прыехаў да нас, быў не проста задаволены, а шчаслівы. «І мы бачым шчаслівыя твары — для нас гэта галоўнае. Вядома, мы шчыра рады не толькі сваім перамогам, але і перамогам сваіх таварышаў, і мы ўпэўненыя, што гэтыя прыгожая барацьба і яркія эмоцыі надоўга застануцца ў памяці ва ўсіх. Калі ласка, хацелася б, каб нашы госці пабывалі на ўсіх спартыўных аб'ектах», — сказаў ён.

Аляксандр Дараховіч выказаў упэўненасць, што найбольшую цікавасць у публікі будуць выклікаць віды спорту, у якіх выступаюць дарослыя спартсмены. Па яго словах, чакаецца аншлаг у пляжным футболе. «Наша задача, каб усе 20 відаў спорту карысталіся шалёнай папулярнасцю і для спартсменаў была падтрымка балельшчыкаў. Хацелася б, каб наш найбліжэйшы рэзерв адчуваў гэтую атмасферу і ўстанаўліваў рэкорды», — падсумаваў першы намеснік міністра.

* * *

Сваімі думкамі наконт значэння Гульняў краін СНД для ўмацавання партнёрскіх сувязяў паміж краінамі і будучыні праекта падзяліліся міністры спорту. Кіраўнікі ведамстваў сустрэліся з журналістамі падчас прэс-канферэнцыі.

Міністр спорту Беларусі Сяргей КАВАЛЬЧУК расказаў, што пры падрыхтоўцы да II Гульняў краін СНД фармат спаборніцтваў доўга абмяркоўваўся з калегамі з іншых краін — удзельніц СНД. І рашэнне аб адкрытым фармаце было прынята сумесна. «Маючы спартыўную інфраструктуру ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, мы прапанавалі павялічыць колькасць відаў спорту, колькасць спартсменаў з-за гэтага павялічылася — 2225 атлетаў сёння зарэгістравана ў нашай акрэдытацыйнай сістэме. І мы хочам, каб наступныя Гульні ў 2025 годзе ў Азербайджане прайшлі яшчэ больш яскрава, прыгожа і маляўніча, — сказаў Сяргей Кавальчук. — Сёння спорт — гэта сіла, якая аб'ядноўвае людзей. Гэта той від дзейнасці, дзе можна атрымаць масу станоўчых эмоцый. Мы бачым, як сёння развіваецца свет, і, на жаль, не ва ўсіх відах спорту можна атрымаць станоўчыя эмоцыі. А на спартыўных пляцоўках нашы гледачы радуюцца перамогам сваіх спартсменаў, засмучаюцца з нагоды іх пройгрышаў».

Сяргей Кавальчук расказаў, што цікавасць да Гульняў краін СНД праявілі краіны Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Але калі пачалася акрэдытацыя на Гульні, у многіх краін ужо былі спланаваны календары правядзення спаборніцтваў на год.

Валерыя СЦЯЦКО.

Гучная справа

МАЗ БЫЎ НЯСПРАЎНЫ, МАРШРУТЧЫК ПЕРАВЫСІЎ КОЛЬКАСЦЬ ПАСАЖЫРАЎ

Следчы камітэт — аб высновах пасля аварыі пад Смалявічамі

Следчы камітэт завяршыў расследаванне крымінальнай справы аб ДТЗ у Смалявіцкім раёне. Трагедыя, якая адбылася ў канцы лютага, забрала жыцці 14 чалавек, у тым ліку дваіх дзяцей — 14-гадовага хлопчыка і 13-гадовай дзяўчынкі. Цяжкія траўмы атрымалі сем пасажыраў маршруткі, якія выжылі, сярод іх дзяўчынкі 11 і 17 гадоў. Пазней адзін з пацярпелых — 51-гадовы мужчына — памёр у бальніцы. Аб расследаванні крымінальнай справы карэспандэнту БелТА расказаў першы намеснік старшыні Следчага камітэта Алег ШАНДАРОВІЧ.

— Алег Станіслававіч, раскажыце, калі ласка, каму даручылі расследаванне крымінальнай справы аб ДТЗ у Смалявіцкім раёне?

— З-за складанасці механізма ўтварэння ДТЗ расследаванне крымінальнай справы даручылі следчым галоўнага следчага ўпраўлення Следчага камітэта. Да крымінальнай адказнасці па ч. 3 арт. 317 КК (парушэнне правілаў дарожнага руху і эксплуатацыі транспартнага сродку, якое прывяло па неасцярожнасці да смерці дзвюх і больш асоб) прыцягнулі кіроўцу філіяла «Аўтамабільны парк № 20» Мінаблаўтатранса. Мужчына прапрацаваў там больш за 40 гадоў.

— Што стала прычынай аварыі?

— Калі вярнуцца да храналогіі здарэння, то можна сказаць наступнае: 20 лютага гэтага года кіроўца грузавога самазвала МАЗ каля 08.00 пачаў перавозку грузаў па маршруце кар'ер «Верасы» — 13-27 км аўтадарогі Р53 Слабада — Навасады ў Смалявіцкім раёне. Раней ён выявіў няспраўнасць хадавой часткі самазвала. Яна была звязаная з разбурэннем ліста правай рысоры пярэдняй падвескі. Гэта аслабіла яе канструкцыю, што, у адпаведнасці з патрабаваннямі правілаў дарожнага руху і тэхнічных рэгламентаў, забараняла эксплуатацыю транспартнага сродку. Ведаючы аб гэтым, кіроўца ад паездак не адмаўляўся, а на працягу рабочай змены зрабіў тры рэйсы па перавозцы грузу.

Каля 14.55 ён выконваў чацвёрты рэйс. Самазвал быў загружаны пяском больш чым на 20 тон, што перавышае ўстаноўленую заводам масу грузу. Ён ехаў на 9 км аўтадарогі Р69 Смалявічы — Смілавічы — Праўдзінскі — Шацк з боку вёскі Пекалін у напрамку вёскі Слабада са скорасцю 65-70 км/г. Гэта прывяло да разбурэння правай рысоры, з-за чаго кіроўца грузавіка страціў кіраванне і выехаў на паласу сустрэчнага руху. У выніку ён сутыкнуўся з аўтобусам Citroen Jumper, які рухаўся ў сустрэчным напрамку і вёз пасажыраў па маршруце Смалявічы — Мінск праз Пекалін. Сваю віну ў інкрымінаваным яму злачынстве кіроўца прызнаў поўнасцю.

Па крымінальнай справе пацярпелымі прызнаныя 34 чалавекі. ААТ «Мінаблаўтатранс» і абвінавачаному заяўлены іскі аб кампенсацыі маральнай шкоды на суму 2 млн 370 тысяч.

— Ці перавышаў кіроўца МАЗа скорасны рэжым?

— Ні кіроўца маршрутнага таксі, ні кіроўца МАЗа скорасны рэжым не парушалі. Разам з тым неабходна адзначыць, што пры выбары скорасці руху кіроўца павінен кіравацца не толькі знакамі, якія абмяжоўваюць скорасць, але і ўлічваць стан транспартнага сродку, грузу, а таксама дарожныя ўмовы. У дадзеным выпадку кіроўца разагнаў няспраўны транспартны сродак з перагрузам практычна да максімальна дазволенай скорасці на гэтым участку дарогі.

— Якія яшчэ абставіны трагедыі ўстанавілі следчыя?

— З заключэння аўтатэхнічнай экспертызы вынікае, што ў аўтамабілі МАЗ няспраўнасць у выглядзе разбурэння аднаго з лістоў правай рысоры пярэдняй падвескі ўзнікла задоўга да здарэння. Такая няспраўнасць магла прывесці да перакосу кузава з рамай і зводу яго з траекторыі. У час расследавання ўстаноўлена, што дазвол на допуск да ўдзелу ў дарожным руху МАЗа скончыўся задоўга да ДТЗ. На лінію транспартны сродак выпусцілі ў няспраўным выглядзе без праверкі яго тэхнічнага стану.

— Што паказала праверка аўтамабільнага парка, грузавік якога выйшаў на лінію ў няспраўным стане?

— З праверэных 60 транспартных сродкаў, якія знаходзяцца на балансе ў аўтамабільным парку, 42 таксама эксплуатаваліся без дазволу на допуск да ўдзелу ў дарожным руху. Яшчэ дзесяць транспартных сродкаў дапускаліся на лінію без заключнага дагавора абавязковага страхавання.

Пытанні эксплуатацыі транспартных сродкаў камунальнымі аўтатранспартнымі арганізацыямі выклікаюць сур'ёзную заклапочанасць. Па даручэнні Следчага камітэта супрацоўнікі транспартнай інспекцыі Міністэрства транспарту і камунікацый прааналізавалі інфармацыю па 8207 транспартных сродках, якія выкарыстоўваюцца аблаўтатрансамі. Пацвердзіліся 4014 фактаў удзелу ў дарожным руху 2071 транспартнага сродку без допуску да ўдзелу ў дарожным руху.

Акрамя таго, праверка выявіла 195 транспартных сродкаў, якія эксплуатаваліся без заключэння дагавора абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці. Фактычна 25 % транспартных сродкаў, якія стаяць на балансе аблаўтатрансаў, не праходзілі тэхнічны агляд і не атрымлівалі допуск да ўдзелу ў дарожным руху.

— Вы адзначылі, што грузавік выпусцілі на лінію ў няспраўным выглядзе без праверкі яго тэхнічнага стану асобай, якая адказвае за бяспеку. Гэта значыць, што нехта, акрамя кіроўцы, таксама павінен быў правяраць яго тэхнічны стан?

— У філіяле «Аўтамабільны парк № 20» спецыялісты, якія адказваюць за выкананне транспартнай бяспекі, работу па правядзенні кантролю за тэхнічным станам рухомага саставу, што знаходзіцца ў камандзіроўках і захоўваецца за межамі аўтапарка, не праводзілі. Такім чынам, няспраўны самазвал дапусцілі да работы.

Таксама адзначу, што раней у аўтапарку «Мінаблаўтатранс» былі выяўлены факты адсутнасці кантролю за тэхнічным станам аўтамабільных транспартных сродкаў пры выпуску на лінію і прыёмцы з лініі. Але, як паказала расследаванне, кіраўніцтва аўтапарка належных мер па выпраўленні сітуацыі, якая склалася, не прыняло. Пры гэтым пасля ДТЗ кіраўнікам аўтапарка спатрэбілася толькі трое сутак для арганізацыі работы дадзенага напрамку.

— Акрамя кіроўцы, кагосьці з супрацоўнікаў аўтапарка, якія выпусцілі на лінію няспраўны самазвал, прыцягнулі да адказнасці?

— З улікам сабраных доказаў у чэрвені бягучага года ў дачыненні да аднаго з кіраўнікоў філіяла «Аўтамабільны парк № 20» распачалі крымінальную справу па ч. 2 арт. 428 КК (невыкананне службовай асобай сваіх службовых абавязкаў, якое прывяло па неасцярожнасці да смерці чалавека або іншых цяжкіх наступстваў). Мужчына прызнаў сваю віну ў поўным аб'ёме.

— У якім стане знаходзілася дарога?

— Аўтадарожная экспертыза ўстанавіла, што пакрыццё праезнай часткі на ўчастку ў раёне 9 км дарогі Р69 Смалявічы — Смілавічы — Шацк на момант правядзення экспертнага агляду не адпавядае нарматыўным патрабаванням. Трэба разумець, што гэта дарога актыўна выкарыстоўваецца для перавозкі самазваламі грузаў з двух кар'ераў «Верасы», што прыводзіць да яе хуткага зносу. Штодзень самазвалы ажыццяўляюць каля 550 рэйсаў. Праектны тэрмін здабычы пяску з гэтых кар'ераў — больш за дзесяць гадоў. Улічваючы, што шырыня палос каля 3 м, інтэнсіўны рух грузавога транспарту павышае рызыку небяспечных сітуацый.

— Якія меры былі прынятыя для паляпшэння стану дарогі?

— У сувязі з даручэннем Следчага камітэта Мінтранс разгледзеў пытанне аб рэканструкцыі і ліквідацыі дэфектаў дарожнага пакрыцця з улікам інтэнсіўнасці руху велікагрузнага транспарту. Прынята рашэнне адраманціраваць найбольш схільныя да разбурэння ўчасткі дарогі з пашырэннем асфальтабетоннага пакрыцця.

— ДТЗ з удзелам маршрутак заўсёды выклікаюць вялікі грамадскі рэзананс. Гэта часта звязана з небяспечнай манерай ваджэння і перавозкай пасажыраў звыш нарматываў. Як ідуць справы з бяспекай эксплуатацыі маршруток?

— Па даручэнні следчых Міністэрства транспарту і камунікацый правяло шырокамаштабную праверку выканання заканадаўства і правілаў бяспекі пры ажыццяўленні перавозак пасажыраў маршрутнымі транспартнымі сродкамі. Супрацоўнікі транспартнай інспекцыі з удзелам ДАІ правялі 123 рэйды і праверылі 1884 аўтобусы катэгорыі М2. Яны выявілі 724 парушэнні ў галіне транспартнай дзейнасці. Было разгледжана 425 спраў аб адміністрацыйных правапарушэннях, а таксама накладзена штрафаў на перавозчыкаў на суму каля Br84 тысяч. Канфіскавана 15 транспартных сродкаў, што не адпавядаюць патрабаванням бяспекі.

— Якія парушэнні выяўляліся часцей за ўсё?

— Найбольш частымі парушэннямі з'яўляюцца перавозка пасажыраў звыш нормы ўмяшчальнасці, наяўнасць няспраўнасцяў, пры якіх эксплуатацыя транспартнага сродку забароненая, адсутнасць допуску да ўдзелу транспартнага сродку ў дарожным руху. Практычна 25 працэнтаў аўтобусаў катэгорыі М2, якія ажыццяўляюць перавозку пасажыраў, эксплуатуецца з парушэннямі. Па віне кіроўцаў маршрутных таксі ў 2023 годзе адбылося 14 ДТЗ.

— Ці парушаліся правілы тэхнічнай эксплуатацыі аўтобуса Citroen Jumper?

— Гэты аўтобус абсталяваны аўтамабільнымі сядзеннямі, якія не адпавядаюць названым катэгорыі і класу транспартнага сродку. Такія сядзенні выкарыстоўваюцца для ўстаноўкі ў аўтобусах іншай катэгорыі. Таксама на момант ДТЗ рамяні бяспекі ў салоне для пасажыраў адсутнічалі. Акрамя таго, трэба звярнуць увагу на той факт, што кіроўца мікрааўтобуса перавозіў 19 пасажыраў, хоць прадугледжана толькі 15 месцаў.

Па выніках ініцыіраваных следствам і праведзеных транспартнай інспекцыяй мерапрыемстваў тэхнічнага характару ў эканамічны суд Мінскай вобласці накіраваны матэрыялы па справе аб адміністрацыйным правапарушэнні арганізацыяй, якой належаў мікрааўтобус, што ўдзельнічаў у ДТЗ, умоў ліцэнзаванай дзейнасці, па якой прадугледжана пакаранне ў выглядзе пазбаўлення дзейнасці на ажыццяўленне пасажырскіх перавозак.

— Якая работа вядзецца цяпер па ўстараненні парушэнняў з боку перавозчыкаў пасажыраў?

— Цяпер па даручэнні ўрада працягваецца разгляд прапаноў Следчага камітэта аб унясенні змяненняў у тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты па пытаннях трываласці мацавання пасажырскіх сядзенняў. Рэгістрацыйныя дакументы дапаўняюцца звесткамі аб катэгорыі і класе аўтобусаў для магчымасці забеспячэння належнага кантролю з боку кантралюючых органаў. Акрамя таго, распрацоўваюцца і прымаюцца дзейсныя меры па абмежаванні ўдзелу ў дарожным руху аўтобусаў, якія не адпавядаюць патрабаванням.

Аб устаноўленых абставінах, прычынах і ўмовах, што садзейнічалі здарэнню, а таксама прапановах па іх устараненні праінфармаваны прэм'ер-міністр Беларусі.

Надвор'е

Пасля трапічнай спякоты — пад халодны «душ»

Асабліва пасвяжэе ўначы, калі чакаецца 6—13 градусаў

Апошні месяц лета гэтымі днямі, здаецца, увайшоў у рэжым чакання. Справа ў тым, што сістэма актыўных атмасферных франтоў з Карпат учора днём працягвала перамяшчацца праз тэрыторыю Беларусі ў паўночным напрамку. Акрамя навальнічных дажджоў рознай інтэнсіўнасці, яна прынесла прахалоду з паўночнага захаду Еўропы. Як адзначылі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды, у найбліжэйшыя суткі ў большасці раёнаў краіны тэмпературны фон пойдзе на спад.

У аўторак халаднаватае паветра распаўсюдзіць свой уплыў ужо ўсюды. У гэты дзень раніцай па поўначы краіны пройдуць дажджы, месцамі навальніцы і моцныя дажджы. Удзень месцамі магчымыя кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах на поўначы прагназуецца ўзмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с. Тэмпература паветра ўдзень будзе ад плюс 16 цяпла на паўночным захадзе да 23 градусаў на паўднёвым усходзе краіны.

Дастаткова свежа будзе ўжо ноччу на сераду. 9 жніўня ўначы ў асобных раёнах па паўднёвым усходзе, а днём месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, у дзённыя гадзіны магчымыя навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў, удзень — 17—24 цяпла.

У чацвер, ноччу пераважна па захадзе, днём на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уночы і раніцай у асобных раёнах чакаецца слабы туман. Днём месцамі прагназуюцца навальніцы. Тэмпература паветра ўначы складзе 7—13 градусаў, удзень — 18—25 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу і суботу стане крыху халадней. У гэтыя суткі, ноччу месцамі, а днём на большай частцы тэрыторыі краіны, пройдуць кароткачасовыя дажджы. У дзённыя гадзіны ў асобных раёнах магчымыя навальніцы. Уначы і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў, месцамі — да плюс 16 градусаў. Удзень будзе 16—22 градусаў, месцамі — да 25 цяпла.

У нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы. Удзень у асобных раёнах магчымыя навальніцы. Ноччу і раніцай месцамі чакаецца слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 6—13 градусаў, месцамі — да плюс 15. Днём стане крыху цяплей — 19—26 цяпла.

У сярэдзіне жніўня чакаем чарговую хвалю цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

Па палічках

Выдача даведкі ў адзін «клік»

Аб перавагах і выгадзе выкарыстання лічбавых зносін

На Адзіным партале электронных паслуг (АПЭП) ужо даступна больш за 300 электронных сэрвісаў. Пра гэта паведаміла начальнік аддзела электроннай камерцыі Нацыянальнага цэнтра электронных паслуг Святлана КАРАНЕВІЧ. Яна адзначыла, што партал электронных паслуг і асабісты кабінет пастаянна абнаўляюцца. Партал існуе ўжо не першы год, але летась адбылася яго глабальная рэнавацыя, таму што з'явіліся новыя магчымасці, якіх раней не было. На партале сабрана 307 відаў электронных сэрвісаў для грамадзян і арганізацый: 195 электронных паслуг і 112 адміністрацыйных працэдур (летась быў доступ да 230 электронных сэрвісаў).

Яны прадстаўлены ў розных галінах — ад падаткаабкладання, сацыяльнай абароны, зямельных і маёмасных адносін да атрымання грамадзянства, эміграцыі, візавай падтрымкі.

Асаблівая ўвага — пераводу ў электронны выгляд менавіта адміністрацыйных працэдур. А іх у нашай краіне больш за тысячу. Кожнаму з нас даводзіцца сутыкацца з адміністрацыйнымі працэдурамі. Гэта вельмі важныя дзеянні. Таму прынята рашэнне да 2025 года алічбаваць 450 новых адміністрацыйных працэдур. Спецыяліст падкрэсліла, што іх пераход у электронны фармат дасць магчымасць вырашаць больш важных пытанняў у адзін «клік».

За паўгода — дзясяткі мільёнаў паслуг

Нацыянальны цэнтр электронных паслуг пастаянна працуе над тым, каб колькасць новых, цікавых, запатрабаваных паслуг у электронным выглядзе расла, каб любая жыццёвая сітуацыя грамадзяніна лёгка і зручна магла быць вырашана ў некалькі «клікаў», няхай гэта будзе атрыманне дазволу на правядзенне аэрафотаздымкі, пропуску на права ўезду ў пагранічную паласу, даведкі аб выплаце падаходнага падатку з фізічных асоб ці аб памеры атрыманай пенсіі.

Усе гэтыя і многія іншыя сэрвісы ўжо рэалізаваны на Адзіным партале электронных паслуг, які з'яўляецца адзінай пляцоўкай электронных дзяржаўных сэрвісаў, падзялілася Святлана Караневіч. З кожным годам алічбаваных сэрвісаў становіцца больш, расце цікавасць грамадзян і суб'ектаў гаспадарання да лічбавых зносін, атрымання паслуг анлайн. Напрыклад, калі ў 2021 годзе з дапамогай агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы (ААІС) праз АПЭП было аказана 17,5 мільёна электронных паслуг, то летась — больш за 76 мільёнаў, а сёлета ўжо каля 60 мільёнаў. Для цэнтра мінулы год стаў вельмі прадукцыйным. Дадалося 37 новых паслуг і чатыры адміністрацыйныя працэдуры. Абноўленая версія асабістага кабінета, магчымасць атрымаць звесткі аб аўтамашыне, даведацца аб памеры сацыяльных дапамог і падаткаў, праглядзець інфармацыю пра вакцынацыю, падаць мытную дэкларацыю — далёка не поўны пералік магчымасцяў, што прапануе цэнтр.

Новыя магчымасці асабістага кабінета

«Для кожнага грамадзяніна, які зарэгістраваны на тэрыторыі краіны, аўтаматычна створаны асабісты кабінет на партале. На ім зарэгістравана больш за 208 тысяч асабістых электронных кабінетаў фізічных асоб і юрыдычных асоб, арганізавана ўзаемадзеянне з 55 дзяржаўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі (сістэмамі), уладальнікамі якіх выступаюць 28 дзяржаўных органаў», — адзначыла начальнік аддзела.

У асабістым электронным кабінеце можна аўтарызавацца з выкарыстаннем ID-карткі і акаўнтаў у сацыяльных сетках, таксама ў ім з'явіліся некалькі дадаткаў. Напрыклад, дадатак сістэмы электроннага дакументаабароту, які дазваляе атрымліваць і адпраўляць карэспандэнцыю з выкарыстаннем сістэмы міжведамаснага дакументаабароту. Дадатак сістэмы электронных паведамленняў і лістам. Таксама ўладальнік асабістага кабінета можа самастойна падпісвацца на паслугі і кіраваць асабістым рахункам для заказу і аплаты электронных паслуг ААІС. Акрамя таго, можна самастойна наладзіць каналы паведамлення.

Яшчэ на партале рэалізаваны механізм выканання поўнага цыкла дзеянняў па атрыманні адміністрацыйнай працэдуры анлайн для грамадзян і юрыдычных асоб. Карыстальнікам даступныя 112 адміністрацыйных працэдур для фізічных і юрыдычных асоб. За 2022 год ажыццёўлена больш за 50 тысяч адміністрацыйных працэдур, а ў 2023 годзе — ужо каля 30 тысяч.

«Адно акно» — у любых версіях

У нашай краіне ўдасканалілі выкананне адміністрацыйных працэдур у электронным форме. У мэтах павышэння эфектыўнасці выканання адміністрацыйных працэдур у электронным форме, аўтаматызацыі дзейнасці службаў «Адно акно» распрацаваны праграмны комплекс «Адно акно» версіі 3.0. З пачатку гэтага года ажыццяўляецца паэтапны пераход на мадэрнізаваную версію праграмнага комплексу «Адно акно». Ён даступны для выкарыстання з дапамогай асабістага электроннага кабінета юрыдычнай асобы на партале мадэрнізаванай агульнадзяржаўнай аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы platform.gov.by. Прадугледжана максімальная канцэнтрацыя працэдур у службе «Адно акно». Дзяржорганы стануць яшчэ больш даступнымі і адкрытымі. У найбліжэйшых планах — пашырэнне пераліку паслуг насельніцтву, якія аказваюцца ў электроннай форме.

Правапарушэнне, страхаванне і звесткі пра аўто

Сярод беларусаў запатрабаванае прадстаўленне фізічным асобам звестак, якія захоўваюцца ў Адзіным дзяржаўным банку даных аб правапарушэннях. Такога характару інфармацыя патрабуецца, напрыклад, пры працаўладкаванні ў дачыненні да самога сябе ці трэцяй асобы (па даверанасці).

Яшчэ адна папулярная ў карыстальнікаў паслуга — «Атрыманне сістэматызаваных звестак пра аўто», дзякуючы якой можна даведацца пра марку, нумары, наяўнасць страхоўкі і тэхагляду аўтамабіля, а таксама праверыць, ці не знаходзіцца ён у вышуку. У бягучым годзе пашыраны пералік даных па гэтай паслузе, і цяпер карыстальнік нароўні з вышэйпералічанай інфармацыяй можа атрымаць звесткі аб дарожна-транспартным здарэнні, калі яно мела месца.

Таксама ў выніку аказання паслугі прадстаўляюцца звесткі аб другім баку дарожна-транспартнага здарэння, а менавіта хто гэта быў (пешаход, іншы транспартны сродак або жывёла). Можна атрымаць інфармацыю і пра пашкоджанні аўтамабіля з прыкладаннем здымкаў пры іх наяўнасці, калі такія звесткі ёсць у базе даных ДАІ.

Акрамя таго, ва ўзаемадзеянні з Міністэрствам унутраных спраў было разгледжана пытанне аб прадстаўленні арганізацыям, якія аказваюць паслугі па пракаце аўтамабіляў (каршэрынг), перавозчы пасажыраў з выкарыстаннем сэрвісаў анлайн-заказаў такіх паслуг (Uber, «Яндэкс» і іншыя), юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам інфармацыі з аўтаматызаванай інфармацыйнай сістэмы дзяржаўнай інспекцыі аб наяўнасці ў грамадзяніна вадзіцельскага пасведчання, а таксама звестак аб наяўнасці ў фізічнай асобы права кіравання механічнымі транспартнымі сродкамі. У сувязі з гэтым у сакавіку з'явіліся зусім новыя электронныя паслугі.

Па ініцыятыве Міністэрства аховы здароўя цэнтрам распрацаваны і аказваюцца з дапамогай партала грамадзянам і медыцынскім арганізацыям электронныя паслугі. Яны прызначаныя для выяўлення фактараў рызыкі развіцця неінфекцыйных захворванняў сістэмы кровазвароту, анкалагічных, хранічных захворванняў лёгкіх, цукровага дыябету на падставе анкетавання. Прагназуецца шырокая запатрабаванасць паслуг з прычыны абавязковай штогадовай дыспансерызацыі дарослага насельніцтва нашай краіны як прафілактыкі неінфекцыйных захворванняў і, як вынік, для зніжэння ўзроўню смяротнасці.

ID-картка і смартфон

Цяпер большасць электронных сэрвісаў на партале арыентавана на юрыдычных асоб, але з кожным годам павялічваецца колькасць паслуг і для грамадзян. У мэтах павышэння спажывецкага попыту, зацікаўленасці ў атрыманні электронных паслуг з выкарыстаннем мабільных прылад, а таксама для папулярызацыі ID-картак сярод насельніцтва была працягнута распрацоўка мабільнага дадатку партала для работы з ідэнтыфікацыйнымі карткамі. Уваход на яго ажыццяўляецца праз адзіную сістэму ідэнтыфікацыі фізічных і юрыдычных асоб.

Мабільны дадатак дазволіць атрымаць доступ да ўсіх паслуг і сэрвісаў, якія даступныя ў бягучай версіі партала. Каб увайсці ў сістэму з дапамогай мабільнай прылады, на ім павінен быць NFC-счытвальнік, які дазволіць узаемадзейнічаць з ID-карткай. Гэта чып, які ёсць у большасці актуальных бюджэтных мадэляў. Калі прывязаць да смартфона ID-картку, мабільны дадатак партала дазволіць атрымаць доступ да ўсіх сэрвісаў, якія даступныя праз браўзер стацыянарнага камп'ютара.

Дадатак дазволіць праводзіць аперацыі ідэнтыфікацыі і пасведчання запытаў і электронных дакументаў з выкарыстаннем яго на ID-картцы. Гатовая для запампоўкі версія з'явіцца да канца года або ў першым квартале наступнага. Яна будзе даступная для Android і iOS-прылад.

Сяргей КУРКАЧ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кароль Камбоджы прызначыў новага прэм'ер-міністра краіны

Кароль Камбоджы Норадам Сіямоні прызначыў 45-гадовага генерал-лейтэнанта Хун Манета новым прэм'ер-міністрам і даручыў яму сфарміраваць урад на наступныя пяць гадоў. Аб гэтым паведаміла ТАСС. Хун Манет, які займаў пасады намесніка галоўнакамандуючага Каралеўскімі ўзброенымі сіламі Камбоджы і камандуючага сухапутнымі войскамі, — старэйшы сын адыходзячага прэм'ер-міністра Хун Сена, што знаходзіўся ва ўладзе 38 гадоў. Узначаленая Хун Сенам кіруючая Народная партыя Камбоджы (НПК) атрымала больш за 82 працэнты галасоў выбаршчыкаў на сёмых у сучаснай гісторыі Камбоджы выбарах у Нацасамблею, якія прайшлі 23 ліпеня. Гэта забяспечыла ёй 120 са 125 дэпутацкіх мандатаў і дало права сфарміраваць новы кабмін. Хун Сен папярэдзіў суайчыннікаў, што не застанецца на пасадзе прэм'ера, і прапанаваў на дадзеную пасаду кандыдатуру Хун Манета, які ўваходзіць у вышэйшае кіраўніцтва НПК.

У Нігеры заявілі аб падрыхтоўцы замежнага ўварвання

Аб гэтым паведаміў тэлеканал Al-Arabiya. «Сутыкнуўшыся з пагрозай інтэрвенцыі, якая становіцца ўсё больш відавочнай з-за падрыхтоўкі суседніх краін, паветраная прастора Нігера закрытая ад нядзелі для ўсіх самалётаў да далейшага апавяшчэння», — гаворыцца ў заяве новага ваеннага ўрада краіны. Раней ECOWAS (Эканамічная супольнасць краін Заходняй Афрыкі) дала тыдзень на тое, каб у Нігеры вярнулі да ўлады прэзідэнта Махамеда Базума, прыгразіўшы ў адваротным выпадку прымяніць сілу для аднаўлення канстытуцыйнага парадку. Пры гэтым заходнія СМІ пісалі, што план магчымага вайсковага ўмяшання ў сітуацыю ў Нігеры ўжо распрацаваны. Вайсковая інтэрвенцыя пакуль адкладзена, бо было недастаткова часу на яе падрыхтоўку, паведаміў The Wall Street Journal са спасылкай на высокапастаўленага камандзіра адной з краін супольнасці.

Колькасць пацярпелых у выніку чыгуначнай катастрофы ў Пакістане павялічылася да 90

Хуткі цягнік, які рухаўся з Карачы ў Абабатабад, пацярпеў крушэнне ў раёне горада Навабшах (правінцыя Сінд). Усяго з рэек сышлі дзесяць вагонаў. Рух па галоўнай чыгуначнай ветцы ў раёне быў перакрыты. Міністр чыгункі Пакістана Хаваджа Саад Рафік заявіў, што прычынай катастрофы магла стаць тэхнічная няспраўнасць або дыверсія, але абставіны здарэння яшчэ трэба будзе вызначыць. Паведамлялася аб 30 загінулых і 60 параненых, піша Associated Press. У паліцыі заявілі аб завяршэнні выратавальнай аперацыі, адзначыўшы, што сярод загінулых і пацярпелых былі жанчыны і дзеці.

Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю КОЗІКА Леаніда Пятровіча, беларускага дзяржаўнага і прафсаюзнага дзеяча, заслужанага работніка прамысловасці, доктара эканамічных навук, прафесара, і выражаюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь смуткуюць у сувязі са смерцю дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь дванаццатага склікання, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання, вядомага дзяржаўнага і грамадскага дзеяча КОЗІКА Леаніда Міхайлавіча і выказваюць глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Сацыяльны праект «Дажынкі»

ЗРОБЛЕНАЕ — ЗАСТАНЕЦЦА

У Ганцавічах завяршаецца падрыхтоўка да правядзення абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі

Юрый ШУЛЕЙКА знаёміцца з ходам работы.

Фестываль працаўнікоў вёскі Брэстчыны папярэдне запланаваны на 9 верасня. Падрыхтоўка райцэнтра да свята выходзіць на фінальную стадыю. На мінулым тыдні старшыня Брэсцкага аблвыканкама Юрый ШУЛЕЙКА праінспектаваў ход работ па падрыхтоўцы да аграфэсту.

Як расказала **намеснік старшыні Ганцавіцкага райвыканкама Алена БАРАНОЎСКАЯ,** райцэнтр на вачах становіцца яшчэ больш камфортным, прывабным, зручным для жыцця гарадам:

— Да фестывалю рыхтуюцца ўстановы і арганізацыі ўсіх сфер, у тым ліку галіны гандлю і бытавых паслуг. На 14 аб'ектах Ганцавіцкага райспажыўтаварыства праведзены бягучы рамонт, на двух аб'ектах працягваецца мадэрнізацыя. Не адстае і прыватны бізнес, прадпрымальнікі актыўна абнаўляюць фасады, добраўпарадкоўваюць тэрыторыю. Пераўтвараецца не толькі горад, але і прыгарадныя сельскія населеныя пункты. Такім чынам, свята станоўча паўплывае на якасць жыцця большасці жыхароў раёна, а зробленае застанецца на доўгія гады.

На фінансаванне мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да «Дажынак» з абласнога бюджэту выдзелена каля 18,5 мільёна рублёў. На сёння асвоена больш за дзесяць з паловай мільёна.

— Да першага верасня асваенне сродкаў плануецца завяршыць і здаць усе аснoўныя аб'екты, — паведаміў **начальнік аддзела архітэктуры, будаўніцтва і жыллёва-камунальнай гаспадаркі райвыканкама Валерый РУСАКЕВІЧ.**

Новая скейт-пляцоўка.

Сродкі ідуць найперш на інфраструктуру: вуліцы і тратуары, інжынерныя камунікацыі — усё, што зробіць горад больш сучасным, прыгожым, зручным. Завяршаецца капітальны рамонт амаль дзесяці кіламетраў вуліц. З'явіліся новае асвятленне і тратуары. На трох аснoўных транспартных артэрыях горада пракладзена ліўневая каналізацыя. Устанаўліваюцца новыя сучасныя прыпыначныя павільёны.

На цэнтральных вуліцах, якія стануць месцамі святкаванняў, капітальны рамонт завяршаецца. Яшчэ раней пракладзены асфальт па вуліцы Суворава, якая злучае паўночна-ўсходні раён горада з чыгуначным вакзалам. Названы раён мае некалькі кварталаў індывідуальнай жылой забудовы, вуліца асабліва важная для транспартных камунікацый навасёлаў. Дарожнікі скончылі працаваць на вуліцах Арлоўскага і Кастрычніцкай. Абнавіліся вуліцы Заслонава, Чайкоўскага, Гагарына, Ламаносава. На скрыжаванні вуліц Арлоўскага і Праскурава радуе вока новы асфальт, роўнымі радамі пракладзена тратуарная плітка. Вуліца, названая ў гонар былога рэдактара раённай газеты Васіля Праскурава, была прыведзена ў парадак раней за кошт раённага бюджэту, цяпер толькі абнавілі тратуары. А вось суседняя Арлоўскага прыхарошаная ў рамках падрыхтоўкі да фестывалю працаўнікоў вёскі стараннямі спецыялістаў мясцовага ДРБУ-100.

Да «Дажынак» капітальна адрамантавалі тры жылыя дамы, яшчэ два — на стадыі завяршэння. На шасці дамах заканчваецца бягучы рамонт.

Шмат што зроблена для паляпшэння аб'ектаў сацыяльнай сферы. Адрамантаваны і мадэрнізаваны гарадскі Дом культуры, дзіцячая школа мастацтваў, сярэдняя школа № 1, дзіцячы садок № 4. У дашкольнай установе праведзены ўцяпленне сцен, замена інжынерных камунікацый. Каб маленькім выхаванцам было цёпла і ўтульна, з бюджэту выдзелена каля 800 тысяч рублёў. У кінатэатр, які таксама пахарашэў і абнавіўся, купляюць новую мэблю.

На тэрыторыі Дома дзіцячай і юнацкай творчасці з'явіўся новы спартыўны аб'ект — скейт-пляцоўка. Фінансаванне яе вялося па абласной інвестпраграме. Пляцоўку адкрылі ў ліпені, і юныя ганцаўчане ўжо аценілі зону актыўнага і бяспечнага адпачынку, яна стала месцам прыцягнення для многіх.

Як адзначыў **намеснік старшыні райвыканкама Сяргей САРОКАЎ,** у сацыяльнай сферы асаблівы ўпор зроблены на медыцыну. Самы вялікі аб'ём работ праведзены ў паліклініцы. Пабудаваная ў канцы 1980-х гадоў, яна ўжо зачакалася мадэрнізацыі. У рамках падрыхтоўкі да «Дажынак» рэканструкцыя вялася паэтапна, каб не перашкаджаць працэсу лячэння людзей. Работа падыходзіць да завяршэння, яна выканана больш чым на 80 працэнтаў. Цяпер вядзецца адстройванне. Тут працуюць майстры прадпрыемства «Палессежылбуд». У іх вялікі вопыт на падобных аб'ектах, таму ёсць усе падставы спадзявацца на высокую якасць праведзенай рэканструкцыі.

Добраўпарадкаванне захапіла і прывакзальную плошчу чыгуначнай станцыі Ганцавічы. Замест асфальтавага палатна пакладзена больш стыльная тратуарная плітка. Сам будынак станцыі таксама папрыгажэў, яго фасад адрамантавалі, а колькасць парковачных месцаў для тых, хто сустракае і праводзіць пасажыраў, павялічылі. Непадалёку ўстанавілі арт-аб'ект — калонку, з якой у былыя часы запраўлялі паравозы вадой.

Такім чынам, большая частка работ скончана. Праводзяцца апошнія мерапрыемствы па адстройванні, добраўпарадкаванні, падрыхтоўцы аб'ектаў да здачы. Калі будаўнікі пакінуць пляцоўкі, сюды прыедуць работнікі зялёнай галіны ЖКГ, зробяць разнастайныя клумбы, упрыгожаць вуліцы і плошчы кветкавымі кампазіцыямі. Ганцавічы вы ўсёй красе сустрэнуць свята, пасля правядзення якога жыхарам застанецца зробленае.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Мясцовая ўлада

РАЁН УЗЫХОДЗЯЧАГА СОНЦА

Старшыня Хоцімскага райвыканкама Геворг МЕЛКАНЯН пра планы добраўпарадкавання гарадскога пасёлка

Хоцімск па сваіх характарыстыках павінен наблізіцца да статусу горада. Ад райцэнтра да Магілёва каля 200 кіламетраў, Мінск яшчэ далей — не наездзішся. Людзі павінны атрымаць на месцы ўсё, што вабіць іх у горадзе: добрыя дарогі, добраўпарадкаванае жыллё, месцы для адпачынку і вольнага часу. Так лічыць старшыня Хоцімскага райвыканкама Геворг Мелканян. Ён ахвотна падзяліўся з чытачамі «Звязды» сваімі планамі.

— Мы будзем імкнуцца да статусу горада, — падкрэсліў Геворг Гарнікавіч. — У ходзе падрыхтоўкі Хоцімска да абласнога свята працаўнікоў вёскі «Дажынкі» ўжо шмат зроблена. Работы пачаліся летась. Басейн практычна пабудаваны, даводзіцца да ладу Дом культуры, бальніцу чакае вялікая рэканструкцыя. Плюс вядзецца добраўпарадкаванне населенага пункта — будуюцца новыя дарогі, тратуары, вуліцы ўпрыгожваюцца кветкавымі кампазіцыямі.

Налета будзем працягваць стварaць аб'екты для заняткаў спортам і культурнага адпачынку. Прывядзём у парадак адкрытую танцпляцоўку ў парку, за сродкі мясцовага бюджэту зробім крыты амфітэатр. Трэба будзе рэканструяваць стадыён, які сёння не адпавядае сучасным параметрам. Існуе даручэнне губернатара, каб у кожным раёне была футбольная каманда, і мы маем намер стварaць умовы для гэтага. Акцэнт робім на аздараўленне нашага насельніцтва, моладзі.

— Шмат хто ведае, што вы самі — заўзяты спартсмен. Любіце футбол, іншыя гульнявыя віды спорту. А па армрэслінгу вам наогул няма роўных.

— Сапраўды, я вельмі люблю спорт (*усміхаецца*). І спрабую прывіць гэтую любоў насельніцтву. Вы бы бачылі, якая тут барацьба ідзе, якія жарсці, эмоцыі кіпяць. У мінулым месяцы кожны тыдзень праходзілі спаборніцтвы па футболе паміж арганізацыямі раёна. Адбыўся футбольны таварыскі матч паміж камандамі Хоцімска і Касцюковіч. Да гэтага месячнік па валейболе праводзілі, раённы турзлёт арганізавалі, добраахвотныя дружыны ў нас спаборнічалі. Пятніца, субота, нядзеля для Хоцімска — спартыўныя дні. У жніўні будзем спаборнічаць па рыбалцы, а яшчэ гуляць у шахматы-шашкі. Зімой установім хакейную пляцоўку на стадыёне, абсталяванне ўжо закуплена, да сезона зманцыруем. Мы адкрылі дзве спартыўныя пляцоўкі — па вуліцы Зялёнай і Ленінскай. 1 верасня будзе адкрыта яшчэ адна — Прэзідэнцкая. Будуецца новае пажарнае дэпо, дзе таксама будзе пабудаваны футбольны стадыён са штучным пакрыццём. Атрымаецца цэлых два на Хоцімск. Яшчэ не ў кожным горадзе такое ёсць.

Не забываем і пра народныя святы — Яблычны Спас, Мядовы, Арэхавы. У нас шмат мерапрыемстваў, якія нацэленыя на згуртаванне і сумеснае баўленне часу. Сёлета адзначаем 130 гадоў нашага храма ў гонар Святой Тройцы. У першую нядзелю кастрычніка плануем правесці фестываль звону.

— Сёння ад кожнага раёна чакаюць па праекце. Што можа прапанаваць Хоцімск?

— Плануем зрабіць рыбгас. Прыязджалі прадстаўнікі рыбгаса «Лахва», каб прыглядзецца да месца. Рэалізацыя праекта запланаваная на 2024—2025 гады. Плануецца стварыць 30 працоўных месцаў з вытворчасцю рыбы каштоўных парод да тысячы тон у год. Мы працуем над замацаваннем маладых спецыялістаў, спрабуем стварыць для іх умовы. Пытаемся, чаго ім не хапае. Работа па замацаванні кадраў пастаўлена вельмі сур'ёзна. 41 малады спецыяліст прыходзіць да нас сёлета, і за кожным з іх замацаваны кіраўнікі арганізацый і ўстаноў, улада, у тым ліку я. Мы павінны стварыць для іх умовы, як для сваіх дзяцей. І я гэта жорстка кантралюю. Жыллё — асноўная ўмова. Кафэ, Дом культуры, басейн, парк атракцыёнаў — усё гэта з разлікам на моладзь. Сёння, на жаль, мала запатрабаваны наш прафесійны каледж, дзе рыхтуюць патрэбных народнай гаспадаркі машыністаў, трактарыстаў, электрагазазваршчыкаў. Гэта ж нашы самыя дэфіцытныя кадры. Таму мы робім усё, каб захаваць тую ўстанову. Матэрыяльная база там адна, напэўна, з найлепшых у вобласці.

— Шмат якія раёны Магілёўскай вобласці сельскагаспадарчыя, Хоцімскі — не выключэнне. Якая ёсць дынаміка?

— Па сельскай гаспадарцы нам даведзена заданне 107 %. На канец ліпеня тэмп росту да мінулага года склаў 98 %, але з усёй упэўненасцю магу сказаць, што да канца года заданне выканаем. Нават сёння ўраджай рапсу, які мы ўбралі, перавышае леташні ў пяць разоў. Ёсць рост па надоях малака. Вельмі дапамагае ў рабоце праграма развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна. Станоўчы вынік дала тэхніка, якая сюды прыйшла; узараныя дадатковыя землі, якія гадамі не ўцягваліся ў севазварот. Дынаміка ў сельскай гаспадарцы станоўчая, але яшчэ далёкая ад ідэальнай. Хоцімскі льнозавод з'яўляецца адным з валаўтваральных для раёна, плошча льну была павялічана ў параўнанні з мінулым годам на сто гектараў і склала 1220 гектараў. Чакаем атрымаць дадатковы даход.

Найбольш паспяховыя прадпрыемствы нашага раёна — ільнозавод, «Жылкамгас», ПМК-276 і «Бабулін падворак». Там сярэдні заробак больш за тысячу рублёў. А самыя прыбытковыя раённыя арганізацыі — «Белтэлекам» і райгаз, у іх сярэдняя зарплата вышэй за дзве тысячы рублёў. На жаль, моладзь па-ранейшаму шукае работу ў Расіі. Хоцімскі раён — самы аддалены, і мясцовае насельніцтва чакае да сябе большай увагі. Калі нас аб'явілі сталіцай абласных «Дажынак», адчуўся ўздым. Наогул Хоцімшчына — край вялікіх магчымасцяў. Мы жывём на скрыжаванні трох рачулак. Адных толькі мастоў у Хоцімску тры. І сонейка ў нас узыходзіць раней, чым дзе, мы ж самыя ўсходнія. Ёсць мара ўпрыгожыць увесь Хоцімск ружамі. Гэтыя кветкі не толькі радуюць вока, але і стварaюць настрой. Убачыце, гэта будзе сапраўдная Венецыя!

Нэлі ЗІГУЛЯ,
фота аўтара.

г. п. Хоцімск.

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

ИНФОРМИРУЕТ
о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Открытому акционерному обществу «Лидская обувная фабрика»

Аукцион состоится 07.09.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71

Лот № 1	
Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона	ЛОТ 1: капитальное строение, инв. № 420/С-52816 (назначение – здание специализированное складов, хранилищ, наименование – здание блока складов), площадью 792,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В. ЛОТ 1 расположен на земельном участке с кадастровым номером 423650100007001038 (назначение – для обслуживания здания блока складов), площадью 0,1324 га по адресу: г. Лида, ул. 8 Марта, 26В. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, расположенный в охранной зоне сетей и сооружений водоснабжения, код – 13,4, площадью 0,0078 га. Условия аукциона: - возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца по проведению независимой оценки объекта в размере 429 р.; - возмещение победителем аукциона (лицом приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца за составление выписки из регистрационной комиссии о правах (ограничениях и обременениях) прав на объект в размере 29,0 р.; - возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведения аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта
Начальная цена продажи	113 520 р. (сто тринадцать тысяч пятьсот двадцать рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	11 352 р. (одиннадцать тысяч триста пятьдесят два рубля)
Реквизиты для перечисления задатка	BY44BLBB30120500833225001001 в дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225
Место, дата и время окончания приема заявлений	Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 05.09.2023 г. до 15.00**
Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/	

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № **2023.Ч.002.00073** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

Продавец: Открытое акционерное общество «Доломит», 210012, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49.

Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY: коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

Дата и время проведения повторных торгов: 07.09.2023 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

Лот № 1. Изолированное помещение с инв. № 200/D-197698 площадью 351,8 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 16-1а, наименование – магазин, назначение – торговое помещение. Наличие мест общего пользования.

Нач. цена: 150 120,00 бел. руб. с учетом НДС.

Задаток: 15 012,00 бел. руб.

Объект находится на земельном участке с кадастровым номером 240155400001000168 площадью 0,2016 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 16 (общее долевое право аренды).

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» etpvit.by.

Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 06.09.2023.

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия повторных электронных торгов:** победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента подписания договора купли-продажи.

Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 378,40 бел. руб. в т.ч. НДС 20 %. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты их проведения. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 346-04-61, Прудников Руслан Александрович.

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа 5/2, пом. 1703, оф. 5. УНП 191021390
Продавец	ОАО «Гомельдрев», г. Гомель, ул. Достоевского, 3. УНП 400021353
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. УНП 191224638 (**www.ipmtorgi.by**)
Предмет электронных торгов	
ПОМЕЩЕНИЕ СТОЛОВОЙ № 1 – 490,5 кв. м (помещение общественного питания), инв. номер 350/D-302161. Адрес: **Гомельская обл., г. Гомель, ул. Ильича, 55А-1**	
Начальная цена лота с НДС 20 % – 379 200,00 бел. руб.	
Задаток **10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок подписания договора купли-продажи	**15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения электронных торгов
Условия оплаты предмета электронных торгов	
Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) рабочих дней** после заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)	
Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона	
Дата и время начала и окончания электронных торгов: 12.09.2023 с 11.00 до 12.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов. **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 11.09.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**	

Контактные телефоны: +375 17-280-36-37; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Передвижная механизированная колонна № 69» (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ ПИЛОРАМЫ

(составные части и принадлежности: подвал), **инв. № 623/С-7733 общей площадью 755,2 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 625682506101000417 площадью 0,9094 га** *(право аренды по 13.12.2121)* **по адресу: Минская область, Узденский район, Озерский с/с, д. Королево, ул. Центральная, 3/9.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона рек и водоёмов, пл. 0,0110 га; зона санитарной охраны источников питьевого водоснабжения централизованных систем питьевого водоснабжения, пл. 0,9094 га.

Начальная цена с НДС (20 %) **– 65 880,00** бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены – **6 588,00** бел. руб.

Цена снижена на 40 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, код категории платежа OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 14.03.2023, 13.05.2023, 10.06.2023, 14.07.2023.

Аукцион состоится **23.08.2023** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **22.08.2023** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64; (8029) 102-21-17. Тел. для осмотра 8 (029) 393-99-70.

УНН 600000236

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОАО «Берестовицкая ПМК № 141»** (УНП 500020631), объявляет о проведении **24.08.2023 г.** с 9.00 до 16.00 электронных торгов в форме аукциона.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **ОДО «ФАРМИН»** (УНП 190073936), объявляет о проведении **07.09.2023 г. в 09.00** публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ

• Взыскание задолженности
• Проведение торгов
• Ликвидация
• Юридические услуги

Извещение о проведении публичных электронных торгов (аукциона) по продаже имущества, принадлежащего **ОАО «Искож»** в процессе ликвидации

Аукцион состоится **07.09.2023,** начало 10.00, окончание 16.00 на электронной торговой площадке (далее – ЭТП) iintorgi.by. Время приема заявок: с 08.08.2023 с 09.00 до 06.09.2023 17.00

Организатор аукциона: ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н, iin.by, iintorgi.by

Продавец: ОАО «Искож», УНП 200250840, 225710, Брестская область, г. Пинск, ул. Брестская, д. 57. **Ликвидатор** Будкевич Николай Петрович, +375 (44) 568-06-70

Лот № 1: Имущество ОАО «Искож», состоящее из 509 единиц основных средств (объекты недвижимости. оборудование действующего производства, вычислительная техника, измерительные приборы, инвентарь), расположенное на земельном участке с кадастровым номером 144500000021000048, площадью 2,8984 га, по адресу: г. Пинск, ул. Корбута, 57. Объект аукциона находится в залоге, в объекте имеются арендаторы.
Начальная цена с учетом НДС 20 % – 12 488 744,09 бел. руб.
Размер задатка – 10 % от начальной цены лота. Шаг торгов – 5 % от начальной цены лота.
Порядок оформления участия в аукционе, условия участия и порядок проведения аукциона, информация об имуществе, входящем в состав лота, размещены на официальном сайте ЭТП «Индустрия Инноваций – Торги» https://iintorgi.by. Задаток перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа – ООО «Индустрия Инноваций»

Контакты: тел.: +375 17-300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении **31 августа 2023 года** торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ»

Предмет торгов
Изолированное помещение с инвентарным номером в ЕГРНИ 500/D-708053898 общей площадью 1913,8 кв. м (наименование: административно-производственное с фотостудией; назначение: помещение многофункциональное)
Местонахождение: г. Минск, ул. Фабричная, 22-9
Начальная цена: 3 271 718,09 бел. руб. с учетом НДС
Сумма задатка: 32 717,18 бел. руб.
Обременение: аренда

Продавец имущества: закрытое акционерное общество «ВИЛИЯ», ул. Фабричная, 22-9, 220033, г. Минск.

Организатор торгов: государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ЗАО «ВИЛИЯ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток (задатки) и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток перечисляется в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе, на расчетный счет BY15 BLBB 3012 0190 3985 8300 1001 в ЦБУ № 527 ОАО «Белинвестбанк» г. Минск, БИК BLBBBY2X, кодификатор назначения платежа – 40901, получатель – государственное предприятие «МГЦН», УНП 190398583, назначение платежа – задаток для участия в аукционе по продаже имущества ЗАО «Вилия».

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник ни согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается в течение 10 календарных дней со дня проведения аукциона при условии оплаты вознаграждения за организацию и проведение торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в следующем порядке: 50 процентов от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение 10 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи; оставшаяся сумма оплачивается не позднее 60 рабочих дней с даты заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся **31 августа 2023 года в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 10.08.2023 по 29.08.2023 включительно** в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. По вопросу осмотра объекта следует обращаться по телефонам: (029) 623-70-80, (029) 556-14-50, (029) 159-24-94.

Телефоны для справок: (017) 365-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»); (029) 159-24-94 (ЗАО «ВИЛИЯ»)

«АДТОК З ПРАФЕСІІ МІНІМАЛЬНЫ»

Аб падрыхтоўцы кадраў напярэдадні 65-гадовага юбілею ГрДМУ расказаў «Звяздзе» рэктар універсітэта Ігар ЖУК

Дата заснавання Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта — 9 жніўня 1958 года. Урачыстыя мерапрыемствы пройдуць крыху пазней — у верасні. Яно і зразумела — цяпер самая гарачая і адказная пара, якая характэрная для ўступнай кампаніі. Клопатаў у кіраўніцтва ўніверсітэта, вядома, нямала. І ўсё ж у рэктара знайшоўся час, каб адказаць на пытанні карэспандэнта «Звязды». Гутарка ў першую чаргу закранула сёлетнюю прыёмную кампанію, але не толькі. Размова таксама датычылася прэстыжу прафесіі ўрача і якасці падрыхтоўкі кадраў.

— Ігар Георгіевіч, у чым асаблівасць сёлетняй прыёмнай кампаніі ў медыцынскі ўніверсітэт?

— Асаблівасцяў нямала. Справа ў тым, што ўступная кампанія праходзіла, можна сказаць, на працягу ўсяго навучальнага года. Падрыхтоўка пачалася з леташняга верасня, і ўжо ў лістападзе мы правялі папярэдні этап універсітэцкай алімпіяды, якая дала магчымасць пераможцам атрымаць пуцёўку ў наш універсітэт. У рэгіянальных медыцынскіх ВНУ тое зроблена ўпершыню.

Алімпіяда праходзіла ў два этапы. Першы — у рэжыме анлайн з удзелам звыш 1,5 тысячы абітурыентаў. У выніку было абрана 220 фіналістаў, якія ў лютым бягучага года прыехалі ў наш універсітэт і тут праходзілі фінальны этап алімпіяды. Былі вызначаны 22 пераможцы, якім уручылі сертыфікаты аб тым, што яны па сутнасці з'яўляюцца студэнтамі медыцынскіх рэгіянальных ВНУ і могуць быць залічаныя на першы курс па абранай імі спецыяльнасці. Пераважная большасць пераможцаў алімпіяды зрабіла выбар на карысць Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта.

— План прыёму не змяняецца? Як вышэйшая навучальная ўстанова адпавядае запытам грамадства?

— План вызначае Міністэрства аховы здароўя ў залежнасці ад кадравай сітуацыі на месцах: якія спецыялісты патрэбныя, у якой колькасці. Гэтыя лічбы даводзяцца да ВНУ. І наша задача — тыя прыёмныя лічбы выканаць. Што датычыцца кантрольных лічбаў гэтага і папярэдняга гадоў, яны практычна не змяніліся.

— Што можна сказаць аб матывацыі студэнтаў пры паступленні? Не атрымліваецца так, што ВНУ прымае «не сваіх» студэнтаў, якія потым «сыходзяць з дыстанцыі»?

— Прыёмнай кампаніі папярэднічае вялікая прафарыентацыйная работа. У ёй удзельнічае ўся сістэма адукацыі. У сярэдніх навучальных установах створаны хіміка-біялагічныя класы, вучні якіх у будучым якраз і бачаць сябе ў медыцыне.

Нашы дэканы, студэнты выязджаюць у іншыя вобласці, знаёмяць з нашым універсітэтам. Студэнты бываюць у тых школах і гімназіях, дзе вучыліся, расказваюць старшакласнікам аб прафесіі ўрача, пра дасягненні нашага ўніверсітэта. Як паказала практыка, такая форма дае станоўчыя вынікі. У ВНУ паступаюць арыентаваныя абітурыенты, якія рэдка мяняюць потым сваё рашэнне.

Як правіла, тут адмоўную ролю могуць адыграць бацькі, якія пераканалі сына альбо дачку паступаць у медыцынскі ўніверсітэт, а тыя не ўпэўненыя ў правільнасці выбару. Тут павінны вучыцца людзі, апантаныя сваёй прафесіяй. Калі студэнт лічыць, што гэта не яго — такія выпадкі выключныя.

— Мяркуючы па інфармацыі па краіне, конкурс у медыцынскія ВНУ быў даволі высокі па Беларусі — 2,5 чалавека на месца. Якія спецыяльнасці найбольш папулярныя?

— Агульны конкурс у Гродзенскі медуніверсітэт сёлета склаў 2,3 чалавека на месца. На некаторых спецыяльнасцях ён вышэйшы. Напрыклад, на педыятрыю і на медыка-дыягнастычным факультэце — 2,6 чалавека на месца, на лячэбным — 2 чалавекі. Конкурс відавочны, усе факультэты запатрабаваныя. Прыём працягваецца. Наступны этап — на платную форму навучання. Такая этапнасць таксама з'яўляецца асаблівасцю сёлетняга прыёму.

— Не так даўно на абласной нарадзе па кадравых пытаннях былі агучаны вынікі сацыялагічнага апытання. Дык вось, 20 працэнтаў старшакласнікаў бачыць сябе ў медыцыне. Гэта столькі, як і ў сферы IT і педагогіцы. Як вы ацэньваеце дадзены рэсурс? Ці ёсць яшчэ вектары росту?

— Гэта даволі высокі працэнт. І мы тое бачым па ўступнай кампаніі. Работа ў згаданым кірунку вядзецца пастаянна. Асноўная мэта сёлетняй прыёмнай кампаніі — даць максімальныя магчымасці для нашых выпускнікоў і моладзі для паступлення ў ВНУ. І мэта, на мой погляд, дасягнутая. Вядома, усе вынікі яшчэ будуць аналізавацца міністэрствам з улікам пажаданняў абітурыентаў і іх бацькоў, наш універсітэт таксама будзе ўносіць свае прапановы па аптымізацыі ўступнай кампаніі. Хачу сказаць, што задачы, якія стаялі перад намі па бюджэтных месцах і па мэтавым прыёме, выкананыя.

— Наколькі апраўдвае сябе мэтавае накіраванне на вучобу, ці ёсць тут новая тэндэнцыя?

— Паступленне на мэтавую форму падрыхтоўкі ў нас апрабаванае, добра сябе паказала. План па прыведзеным кірунку даводзіўся даволі высокі — 50 працэнтаў бюджэтных месцаў павінны заняць мэтавікі. Сёлета пастаўлена задача аддаць мэтавікам 60 працэнтаў бюджэтных месцаў, а па педыятрыі — наогул 80 працэнтаў. Такая высокая планка заяўлена ўпершыню.

Калі раней бюджэтнікі і мэтавікі ішлі, што называецца, адным эшалонам, то сёлета мэтавікі пасля падачы дакументаў здавалі вусны экзамен па спецыяльнасці «Біялогія». І паступалі па выніках дзвюх адзнак — сярэдняга балу атэстата і экзамену па біялогіі. Такім чынам, з 490 бюджэтных месцаў 320 належыць студэнтам-мэтавікам.

Хачу адзначыць, што праблем з наборам мэтавікоў ніколі не было. Гэтаму папярэднічае вялікая інфармацыйная работа. На жаль, часта ў грамадстве прысутнічае не зусім правільнае разуменне мэтавага прыёму. Некаторыя лічаць, што гэта амаль што «прыгоннае права». Як вядома, мэтавік абавязаны адпрацаваць пяць гадоў па размеркаванні. Але гэта не абавязкова адна і тая медыцынская ўстанова. Выпускнік можа пачаць, напрыклад, з раённай паліклінікі, а праз 3-4 гады працаваць ужо ва Універсітэцкай клініцы ў Гродне. Такой канкрэтнай прывязкі тут няма. Па-другое, могуць змяніцца сямейныя абставіны, у сувязі з чым мяняецца і месца работы, гэта можа быць і іншы рэгіён.

— Мне здаецца, што медыкі — адны з тых спецыялістаў, якія не пераходзяць у іншую прафесійную сферу, а трымаюцца сваёй прафесіі і надалей...

— Мы вывучаем, як нашы выпускнікі замацоўваюцца на першым месцы размеркавання. Што датычыцца сістэмы аховы здароўя Гродзенскай вобласці, больш за 80 працэнтаў бюджэтнікаў і мэтавікоў застаецца працаваць і далей на месцы размеркавання. Гэта сведчыць аб тым, што мясцовыя органы ўлады зацікаўленыя ў маладых спецыялістах.

Вядома, ёсць і праблемы, ёсць дзесьці і цякучка маладых спецыялістаў, якія адпрацавалі і з'ехалі. Гэта ў пэўнай ступені віна мясцовых органаў улады, кіраўнікоў медыцынскіх устаноў. Своечасова не былі створаны ўмовы для стымулу, росту маладога спецыяліста, для яго самарэалізацыі. Лічу, калі да маладых спецыялістаў адносяцца належным чынам, дапамагаюць ім вырасці ў прафесійным плане, забяспечваюць неабходнай сацыяльнай інфраструктурай, тады яны застаюцца, бо адчуваюць, што патрэбныя. Важную ролю тут адыгрывае сістэма настаўніцтва.

— Ці відавочная праблема адтоку кадраў за мяжу?

— Адток з прафесіі мінімальны. Хоць часам даводзіцца чуць пра масавы адток кадраў за мяжу. Міграцыя працоўных рэсурсаў заўсёды была. Што датычыцца Гродзенскай вобласці, мы гэту сітуацыю сумесна з галоўным упраўленнем аховы здароўя адсочваем і бачым, што ніякага катастрафічнага адтоку кадраў з галіны няма. Так, з'язджаюць, але не сотні і не тысячы. Апошнім часам у нас многае зроблена для таго, каб павысіць заработную плату медыкам. Гэта таксама адзін са стымулаў у замацаванні маладых спецыялістаў. Як вядома, рашэннем Прэзідэнта пакінутыя ўсе «ковідныя надбаўкі», якія былі ў перыяд пандэміі. Гэта таксама важны стымул.

— Прафесія ўрача заўсёды была прэстыжнай, як, дарэчы, і вучоба ў медыцынскай ВНУ. Ці захоўваецца такая тэндэнцыя сёння?

— Бясспрэчна, імідж урача ў нашай краіне даволі высокі. Адпаведна, высокі імідж і нашай навучальнай установы. Аб гэтым сведчыць і той факт, што да нас прыязджаюць студэнты з 30 краін свету за прафесійнай падрыхтоўкай. Цяпер наша дэлегацыя знаходзіцца ў Індыі, дзе сустракаецца з патэнцыйнымі абітурыентамі. Да перагавораў прыцягнуты і пасол Беларусі ў Індыі. Былі перагаворы ў Шры-Ланцы.

Мы працуем над тым, каб пашырыць геаграфію краін, бо гэта і пазабюджэтныя даходы, і імідж нашай краіны за мяжой. Нашы выпускнікі-замежнікі працуюць больш чым у ста краінах свету. Праз асацыяцыю выпускнікоў мы атрымліваем вельмі добрыя водгукі аб якасці падрыхтоўкі нашых спецыялістаў. Нядаўна прадстаўнікі Індыі паведамілі, што ў 97 працэнтах выпадкаў выпускнікі Гродзенскага медуніверсітэта пацвярджаюць свой дыплом у розных краінах свету. Далёка не ўсе ўніверсітэты СНД і Еўропы маюць такі ўзровень. Сёлета ў нас 116 чалавек-замежнікаў атрымалі дыпломы. На ўрачыстае ўручэнне прыязджалі родныя выпускнікоў і вельмі высока ацэньвалі якасць беларускіх урачоў. Таксама яны былі задаволеныя тым, што Беларусь — бяспечнае для пражывання і вучобы краіна.

— Сёлетні год і ўступная кампанія асаблівыя яшчэ і ў юбілейным плане. Якраз днямі споўніцца роўна 65 гадоў з таго часу, калі 9 жніўня была падпісана пастанова Савета Міністраў БССР аб стварэнні ў Гродне медыцынскага інстытута, і на першы курс было залічана 250 чалавек. Сёння такая лічба ўдвая большая. Як будзе адзначацца юбілейная дата?

— Урачыстасці з нагоды юбілею пройдуць у верасні. Ужо складзены план святкавання. Пройдзе ў тым ліку маштабная міжнародная канферэнцыя. Хачу адзначыць, што Гродзенскі медуніверсітэт — адзіны ўніверсітэт Беларусі, які чатыры разы станавіўся лаўрэатам Прэміі Урада Беларусі.

Мы ганарымся тым, што за мінулыя гады тут атрымала прафесію звыш 26 тысяч выпускнікоў, якія працуюць у Беларусі і ў розных краінах свету. Іх дзейнасць адзначана пазітыўнымі водгукамі. Гэта сведчыць, што тыя традыцыі, якія былі закладзены падчас заснавання ўніверсітэта, тады яшчэ Гродзенскага медыцынскага інстытута, захоўваюцца і развіваюцца.

Маргарыта УШКЕВІЧ.
Фота прадастаўлена ГрДМУ.

Прыёмная кампанія — 2023

У лідарах — псіхалогія і інклюзіўная адукацыя

У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце прайшло залічэнне на бюджэтныя месцы. На дзённае аддзяленне было прынята 1057 заяў на 618 месцаў, якія засталіся пасля завяршэння мэтавага прыёму (ён праходзіў у чэрвені), на завочную поўную форму навучання — 250 заяў на 160 месцаў і 211 чалавек прэтэндавалі на 115 месцаў на завочнай скарочанай форме навучання.

Сярод залічаных на бюджэтныя месцы скончылі школу з залатым або сярэбраным медалём 40 чалавек, маюць дыпломы з адзнакай 54 выпускнікі каледжаў. Выпускнікоў профільных педагагічных класаў сярод будучых першакурснікаў — 238 чалавек. Выпускнікоў ліцэяў і гімназій — 211.

У прыёмнай камісіі ВНУ канстатуюць рост у бягучым годзе прахадных балаў. Для таго каб паступіць на «Псіхалогію», трэба было набраць не менш як 361 бал. Далей ідуць «Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя» — 335, «Арганізацыя і кіраванне фізічнай культурай, спортам і турызмам» — 334, «Мастацкая адукацыя» — 323, «Фізічная культура» — 319, «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя» — 308, «Гістарычная адукацыя» — 301 бал.

Месцы на ўсіх чатырох спецыяльнасцях філалагічнага факультэта занялі абітурыенты-льготнікі, гэта значыць абітурыенты, якія маюць медалі пасля заканчэння школы або дыпломы з адзнакай, а таксама выпускнікі педагагічных класаў — дадзеныя катэгорыі абітурыентаў паступаюць без здачы ЦЭ і ЦТ.

У БДПУ канстатуюць, што выраслa колькасць абітурыентаў з сумай балаў больш за 300. Так, на спецыяльнасці «Псіхалогія» такіх абітурыентаў 48 % ад агульнай колькасці тых, хто падаў дакументы, на спецыяльнасці «Спецыяльная і інклюзіўная адукацыя» — 47 %, «Сацыяльна-педагагічная і псіхалагічная адукацыя» — 32 %.

На спецыяльнасцях завочнай формы атрымання адукацыі склалася наступная сітуацыя. Найбольш высокі конкурс (1,9 чалавека на месца) зафіксаваны на спецыяльнасці «Пачатковая адукацыя», 1,8 чалавека на месца — на «Дашкольнай адукацыі», 1,6 чалавека на месца — на «Сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай адукацыі».

«БДПУ — адна з самых спартыўных ВНУ краіны, — падкрэсліваюць у прэс-службе ўніверсітэта. — Сёлета да нас прыйшлі спартсмены высокага ўзроўню: сярод іх чэмпіёны Еўропы, пераможцы Алімпійскіх дзён моладзі, пераможцы пяршынстваў Рэспублікі Беларусь, дзесяць майстроў спорту, кандыдатаў у майстры спорту — 21, спартсменаў з першым разрадам — 24 чалавекі».

Радуе, што ў апошнія гады расце папулярнасць педагагічнай прафесіі сярод юнакоў. Не стала выключэннем і апошняя прыёмная кампанія, бо сярод тых, хто паступіў на гістфак, — больш за 60 працэнтаў хлопцаў, на факультэце фізічнага выхавання і фізіка-матэматычным іх — 40 працэнтаў».

Гэтымі днямі ў БДПУ працягваецца прыём дакументаў на платную форму навучання. Абітурыентаў чакаюць да 9 жніўня.

Надзея НІКАЛАЕВА.

II ИГРЫ СТРАН СНГ БЕЛАРУСЬ 2023

ВЕЛЬМІ СКЛАДАНЫ І ВЕЛЬМІ ВАЖНЫ СТАРТ

Падводзім вынікі спаборніцтваў па мастацкай гімнастыцы

Рэдка здараецца такое, што з важнага міжнароднага старту беларускія гімнасткі вяртаюцца без узнагарод. II Гульні краін СНД выключэннем не сталі. Спаборніцтвы па мастацкай гімнастыцы адкрылі праграму Гульняў і задалі пераможны настрой астатнім відам спорту. Усяго ў актыве беларускай каманды — дзесяць медалёў! Калі ў кожным медалі ёсць і доля падтрымкі гледачоў, то аматары мастацкай гімнастыкі ўнеслі значны ўнёсак у поспех дзяўчат. Тры дні трыбуны сталічнага Палаца мастацкай гімнастыкі былі забітыя поўнасцю. Жадаючых было настолькі шмат, што палац не мог умясціць усіх, хто хацеў убачыць спаборніцтвы. Але арганізатары не разгубіліся і ўстанавілі проста на вуліцы экран, на якім трансліраваўся турнір. Нават спякотнае надвор'е не напалохала аматараў мастацкай гімнастыкі. Не проста цёпла, а нават горача было і ў спаборніцкім зале.

У першую чаргу — ад колькасці зорак. Мастацкая гімнастыка стала адным з пяці відаў праграмы II Гульняў, у якім удзельнічалі дарослыя спартсмены. На родным дыване выступала бронзавая прызёрка Алімпійскіх гульняў у Токіа, лідар беларускай зборнай Аліна Гарнасько. Канкурэнцыю ёй складала расіянка Лала Крамарэнка, трохразовая чэмпіёнка свету сярод юніёраў. Ажыятаж выклікала і выступленне другой расійскай гімнасткі, шматразовай чэмпіёнкі свету і Еўропы Арыны Аверынай.

А на трыбунах за выступленнямі дзяўчат сачылі тыя, на каго сённяшнія спартсменкі калісьці марылі стаць падобнымі. Двухразовая алімпійская чэмпіёнка, шматразовая чэмпіёнка свету Яўгенія Канаева заўважыла, што арганізатарам удалося зрабіць свята, а не проста спаборніцтвы. «Беларусы ўвогуле славяцца сваёй душэўнасцю, хатняй абстаноўкай, шчодрасцю на ўвагу, таму вельмі рада тут знаходзіцца. На спаборніцтвах па мастацкай гімнастыцы II Гульняў краін СНД дастойная канкурэнцыя, глядзець іх вельмі цікава. Часцей бы так!» — падзялілася спартсменка.

Госцяй спаборніцтваў стала і сярэбраная прызёрка Алімпіяды ў Рыа, шматразовая чэмпіёнка свету Яна Кудраўцава. Яна падкрэсліла, што такія спаборніцтвы

сёння неабходныя спартсменкам: «З прычыны тых абмежаванняў, якія ёсць, любыя спаборніцтвы вельмі карысныя і з'яўляюцца штуршком наперад. Таму лічу, што праводзіць іх трэба і важна. Тут, на II Гульнях краін СНД, сур'ёзная канкурэнцыя, так што гэта сапраўды рух уверх. Мне тут вельмі падабаецца ўсё — ад арганізацыі да дзяўчат. Даўно не прысутнічала на турнірах, а тут убачыла і расквітнела. Таксама хочацца выступіць».

Галоўнай госцяй заключнага дня спаборніцтваў стала легендарная гімнастка, алімпійская чэмпіёнка Аліна Кабаева. «Я вельмі люблю беларускую зборную, вельмі люблю Ірыну Юр'еўну Ляпарскую. І люблю даўно. Калі ў 2000 годзе я прайграла Алімпійскія гульні, праводзіла з імі шмат часу, бо мне было вельмі складана знаходзіцца ў сваёй камандзе, і беларускія дзяўчаты тады мяне падтрымлівалі», — падзялілася яна. Аліна Кабаева таксама расказала, што дарогу ў вялікі спорт ёй дала менавіта Ірына Ляпарская. «У 1998 годзе я першы раз прыехала на чэмпіянат Еўропы. І мая трэнер Ірына Аляксандраўна Вінер сказала, што трэба трапіць у трыццатку. І так здарылася, што я там выйграла. Калі я добра зрабіла скакалку, Ірына Аляксандраўна сказала, што высокі бал мне не паставяць, бо там судзіць Ірына Юр'еўна Ляпарская з Беларусі. Я была радая і другому месцу. Але Ірына Юр'еўна паставіла мне вышэй, чым сваёй вучаніцы, бо я зрабіла вельмі добра, і я ёй за тое вельмі ўдзячная», — расказала чэмпіёнка. Атмасферу, якая панавала на II Гульнях краін СНД, яна параўнала з атмасферай чэмпіянату свету. «І выдатна, што мы разам развіваем наш выдатны від спорту. Цяпер чакаю беларускіх гімнастак на сваім турніры ў Шанхаі», — падкрэсліла Аліна Кабаева.

З такой падтрымкай спартсменкі проста не маглі не паказаць прыгожай гімнастыкі. І яны яе паказалі. У індывідуальных спаборніцтвах па многабор стве перамагла расійская гімнастка Лала Крамарэнка. На другім месцы — беларуская гімнастка Аліна Гарнасько. Замкнула тройку прызёрак расіянка Арына Папова. Беларуская гімнастка Лізавета Зоркіна спынілася за крок ад п'едэстала. «Я ўвогуле люблю гімнастак з Беларусі, яны вельмі музычныя, выконваюць цікавыя знаходкі. У іх заўсёды адметная праграма. Уся зборная такіх балерын», — адзначыла Яўгенія Канаева.

Беларускі гімн у гонар «зборнай балерын» у Палацы мастацкай гімнастыкі гучаў неаднаразова. Першы раз у гонар нашых дзяўчат, якія перамаглі ў групавых практыкаваннях. Беларускія юніёркі набралі 69,35 бала. Трэнер юных спартсменак Марына Ганчарова выступленнем сваіх падапечных засталася задаволеная. Па яе словах, дзяўчаты рваліся на дыван, у іх было каласальнае жаданне, яны адчувалі свой шанц.

«Групавічкі» — Ганна Шакун, Валерыя Мальковіч, Таісія Ярчак, Агнія Селіванава, Злата Бучанкова і Кір'яна Шаўцова — таксама сталі пераможцамі ў практыкаванні з пяццю мячамі. А ў кампазіцыі з пяццю скакалкамі дзяўчаты занялі другое месца.

«Напэўна, у практыкаванні са скакалкай нам была патрэбная тая страта, каб на практыкаванні з мячамі мы выйшлі з вялікім азартам і «рванулі» так, каб ва ўсіх пайшлі мурашкі па скуры! У нас самых яны былі. Гэта старт, да якога мы ішлі два гады. Ён быў вельмі важны для нас. У сувязі з тым, што адбываецца па-за спортам, мы не можам выступаць на буйных спаборніцтвах, таму для нас II Гульні краін СНД — самыя буйныя і важныя спаборніцтвы на гэтым этапе. Мы вельмі рыхтаваліся да іх — і слёзы, і радасць былі, і лаяліся, і мірыліся. Усё дзеля гэтых трох дзён, на якіх мы вылажыліся на максімум. Была адна невялікая страта, але пасля сабраліся і зрабілі мячы так, што апладзіравала ўся зала. Нам было вельмі прыемна. Мы кажам пра гэта ў кожным інтэрв'ю, можа, і банальна, але падтрымка проста неверагодная. Там сядзяць нашы сяброўкі — старэйшыя спартсменкі. Алімпійскі састаў хварэў за нас — нерэальна прыемна! Заўзятары былі не толькі з Мінска — да нас падышлі дзяўчынка з мамай, якія прыехалі з Гомельскай вобласці, каб пахварэць за нас», — падзяліліся сваімі ўражаннямі «залатыя» дзяўчаты.

«ЭМОЦЫІ ЯШЧЭ НЕ ХУТКА ПРЫЙДУЦЬ У НОРМУ»

Яшчэ перад пачаткам спаборніцтваў па мастацкай гімнастыцы галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Ірына Ляпарская сказала, што асноўная барацьба разгорнецца паміж камандамі Беларусі і Расіі. Усе гэта ўбачылі падчас спаборніцтваў сеньёрак у асобных відах. Аліна Гарнасько заваявала «золата» ў практыкаванні з мячом, «серабро» — у кампазіцыі з булавамі. Бронзавыя медалі Аліне прынеслі выступленні з абручом і стужкай.

«Вельмі складаны быў старт. Вельмі шмат эмоцый, і яны яшчэ не хутка прыйдуць у норму. Задаволеная сваім сённяшнім выступленнем. У многаборстве ў мяне былі памылкі, але я выйшла і выправіла іх. Трэнеры мною задаволеныя», — падзялілася Аліна Гарнасько сваімі ўражаннямі пасля цырымоніі ўзнагароджання.

Беларуская спартсменка Лізавета Зоркіна стала бронзавай прызёркай у выступленні з мячом. «Вопыт, вопыт і яшчэ раз вопыт», — такім чынам спартсменка ахарактарызавала выступленне на II Гульнях краін СНД. Лізавета Зоркіна выступала і на I Гульнях краін СНД, дзе была першай у практыкаванні з мячом. Але тады яна была яшчэ юніёркай, а сёння выступае на дарослым узроўні. Як адзначыла сама спартсменка, у 2021 годзе спаборніцтвы былі зусім іншыя. «Дома, у такой атмасферы, пры такой неверагоднай падтрымцы я спаборнічала ўпершыню. Было вельмі прыемна», — падзялілася Лізавета.

Расійскі гімн на цырымоніі ўзнагароджання гучаў у гонар Арыны Аверынай, якая перамагла ў практыкаванні з абручом. «Турнір атрымаўся насычаны, яркі, грандыёзны. Публіка падтрымлівала вельмі моцна, гэта адчувалася. У апошні дзень асабліва: была сапраўдная бітва, да апошняга не было зразумела, хто выйграе. На самай справе я перад сабой не ставіла мэты абавязкова перамагчы, але не хацела падводзіць каманду, трэнераў, сябе. Хацела паказаць тое, што ўмею, падарыць радасць гледачам», — падзялілася Арына з журналістамі. Яшчэ адна расійская гімнастка Лала Крамарэнка стала найлепшай у практыкаванні з булавамі і стужкай.

Аднак пры ўсёй прыгажосці спаборніцтваў па спартыўнай гімнастыцы знайшліся ў іх і «мінусы», на якія ўказала двухразовая алімпійская чэмпіёнка па спартыўнай гімнастыцы Святлана Хоркіна. «Акрамя гэтых спаборніцтваў, яшчэ нічога не паспела паглядзець — мастацкая гімнастыка не адпускала! Яна заўсёды паглынае ўсю маю ўвагу — гэта ж так прыгожа», — сказала яна.

Па словах чэмпіёнкі, Гульні краін СНД — спаборніцтвы цудоўнага фармату: «Нашы спартсменкі паказваюць сваё майстэрства на выдатных пляцоўках. Шкада, што ў пераліку відаў спорту, уключаных у праграму, няма спартыўнай гімнастыкі. Спадзяюся, на III Гульнях краін СНД будзе прадстаўлена і яна!»

А пакуль да III Гульняў краін СНД яшчэ ёсць час, беларускія гімнасткі сыходзяць у невялікі водпуск. А затым пачынаюць плённую падрыхтоўку да Кубка Рэспублікі Беларусь.

Валерыя СЦЯЦКО.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

НОВЫЯ ПЕРАМОГІ З ЯДРОМ І МОЛАТАМ

У Рэспубліканскім цэнтры алімпійскай падрыхтоўкі па лёгкай атлетыцы ў нядзелю было горача. У фінальных спаборніцтвах дзяўчаты і юнакі пазмагаліся ў кіданні молата, юнакі — у штурханні ядра.



У фінале спаборніцтваў па штурханні ядра залаты медаль заваяваў беларус Анатоль Хоміч. Другі вынік паказаў расіянін Максім Сакалоў. Дастанбек Абдымуталаў з Узбекістана стаў уладальнікам «бронзы».

Трэнер беларускай зборнай Людміла Кунац расказала, што Анатоль Хоміч усяго год займаецца штурханнем ядра. Таму, па яе словах, падчас падрыхтоўкі было праблемна зрабіць паварот падчас кідка. Але ён справіўся. «Гэта дастойная перамога і цудоўны вынік», — адзначыла трэнер.

Анатоль Хоміч распавёў, як трапіў у лёгкую атлетыку. «Я пайшоў займацца ў спартыўную школу, і ў мяне атрымалася. Спачатку выйграваў раённыя спаборніцтвы, потым выйшаў на вобласць. І там таксама паказаў дастойны вынік. Мяне заўважылі і запрасілі ў Брэсцкае абласное вучылішча алімпійскага рэзерву. Там я займаўся больш актыўна, выйшаў на ўзровень рэспубліканскіх спаборніцтваў і выйграў іх чатыры разы. А цяпер пакарыў міжнародныя спаборніцтвы», — сказаў спартсмен і дадаў, што плануе заставацца ў спорце і браць новыя вышыні.

Расіянін Максім Сакалоў адзначыў, што галоўнае для яго было не месца, а асабісты вынік: «Я заўсёды настроены на вынік. Былі думкі, што займу нейкае месца, але імкнуўся на тое не адцягвацца. Трэба было засяродзіцца на самім спаборніцтве. Лёгкай атлетыкай займаюся пяты год, і для мяне гэта вялікае задавальненне».

Трэнер каманды Узбекістана па лёгкай атлетыцы Мікалай Барысаў падкрэсліў, што Гульні — цудоўнае свята для маладых спартсменаў. «Іх правядзенне трэба абавязкова працягваць. І арганізоўваць нават не раз у два гады, а часцей. І рабіць гэта ў розных краінах, каб спартсмены маглі паглядзець свет. Гульні робяць дзяржавы больш дружнымі, яны збліжаюць», — лічыць ён. Узбекістан збіраў сваю каманду па лёгкай атлетыцы па ўсёй краіне.

Мікалай Барысаў падкрэсліў, што ўражаны ўзроўнем арганізацыі II Гульняў краін СНД: «Самі спаборніцтвы, пражыванне і харчаванне — усё на найвышэйшым узроўні. У вас добра ўладкаваны спартыўныя аб'екты. Усе нашы работы вельмі задаволеныя».

Спаборніцкую праграму другога дня ў РЦАП па лёгкай атлетыцы закрываў фінал у кіданні молата сярод мужчын. Медалістамі сталі два беларусы: Мікіта Тараўскі адправіў молат на 64,82 метра і заняў другое месца, Ілья Варапаеў паказаў вынік 64,13 метра і выйграў «бронзу». Пераможцам II Гульняў краін СНД па кіданні молата стаў прадстаўнік Расіі Максім Херсонцаў, які закінуў молат на 67,48 метра.

«Прафесійна займаюся спортам паўтара года. Было хвалюючы, вельмі перажываў, але рады, што ўсё атрымалася, і не збіраюся спыняцца на дасягнутым, — расказаў Максім Херсонцаў. — Мне падабаецца ў Беларусі, нас прынялі па-сяброўску, у вас вельмі гасцінна і прыгожа».

Таксама на базе РЦАП па лёгкай атлетыцы вызначылі наймацнейшых з юных кідальніц молата. Два найлепшыя вынікі паказалі прадстаўніцы Беларусі. «Золата» заваявала Софія Каралёнак, якая ў найлепшай са спроб адправіла снарад на 64,15 метра. «Серабро» дасталася нашай Вераніцы Шчарбянок, якая кінула молат на адзнаку 60,83 метра. Тройку найлепшых дапоўніла расіянка Варвара Іванова з вынікам 58,57 метра.

«Напружанне вельмі сур'ёзнае», — такімі словамі ахарактарызаваў спаборніцтвы трэнер лёгкаатлеткі Сафіі Каралёнак, якая заняла першае месца ў кіданні молата, Канстанцін Астапковіч. Ён расказаў, што падрыхтоўка да II Гульняў краін СНД у спартсменкі ішла паралельна з іншымі спаборніцтвамі.

— Мы ставілі задачу, давалі разміначныя спробы, яны ўдзельнічалі ў іншых спаборніцтвах. Трэніраваліся на базе Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі і паступова прывыклі. Але напружанне было ўсё роўна вельмі сур'ёзнае, — адзначыў Канстанцін Астапковіч.

Па словах трэнера, Гульні з'яўляюцца значнай падзеяй.

— Мы дэманструем усяму свету, што можам працаваць і паказваць дастойны вынік, — падкрэсліў ён.

Як адзначыла Сафія Каралёнак, перад спаборніцтвамі было вельмі страшна.

— Але потым сабралася, паставіла асабісты рэкорд. Таму ўражанні добрыя, — сказала пераможца. Яна дадала, што ёй было вельмі цікава пазнаёміцца і паспаборнічаць са спартсменкамі з іншых краін.

Удзел у мультыспартыўным форуме бярэ падрастаючае пакаленне лёгкаатлетаў з дзевяці краін — спартсмены 2009 года нараджэння і маладзейшыя. Акрамя 67 юных прадстаўнікоў Беларусі, у сектары і на дарожкі выходзяць прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота БелТА.

Адстраляліся на «золата»!

Працягваюцца спаборніцтвы па кулявой стральбе

У мінскім спартыўна-стралковым комплексе імя Цімашэнкі праходзіць турнір па кулявой стральбе. Першым відам праграмы стаў адборачны турнір у стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі сярод змешаных камандаў. Усе прызавыя месцы занялі расійскія стралкі. «Золата» заваявалі Анастасія Мураўёва і Яўген Патапаў, «серабро» — Віялета Адзінаева і Максім Міхайлаў, «бронзу» — Айгуль Хабібуліна і Мацвей Патапаў.

«Узровень спартсменаў розны, але ў кожнай краіне ёсць свая зорачка, гэта натуральна. Тую зорачку яны сюды прывезлі і хочуць, каб яна тут раскрылася, таму што для іх, юніёраў, гэта высокі ўзровень. І паказаць тут высокі, дастойны вынік — гэта выдатна», — распавяла журналістам суддзя спаборніцтваў Валянціна Тоўкач.

У стральбе з пнеўматычнага пісталета ў міксце беларускія спартсмены Іван Казак і Зоя Дасько выйгралі залатыя медалі. Усяго ўдзел у стральбе з пнеўматычнага пісталета сярод змешаных камандаў узялі 15 пар. Па выніках адбору Іван Казак і Зоя Дасько трапілі ў дуэль за залатыя медалі, дзе сапернікамі нашага дуэта сталі расіяне Ігар Шалудзякоў і Валерыя Ганакова. Перамогу беларускім спартсменам прынёс вынік 16:14. «Займаюся спортам ужо 7-8 гадоў. Фінал быў вельмі хвалюючы, а старт — самы важны для нас, было вельмі страшна», — адзначыла Зоя Дасько.

Яшчэ адзін беларускі тандэм — Уладзіслаў Дэмеш і Аляксандра Пятрова — выступіў у «малым фінале» за бронзавыя ўзнагароды, дзе саступіў Аліне Лісіцы і Данііле Салаўёву з Расіі з лікам 7:17. Удзел у спаборніцтвах па кулявой стральбе на II Гульнях краін СНД бяруць спартсмены з дзевяці краін — Беларусі, Азербайджана, Арменіі, Казахстана, Кыргызстана, Расіі, Таджыкістана, Туркменістана і Узбекістана. Беларусь прадстаўлена двума саставамі ў колькасці 26 стралкоў.

З 7 да 10 жніўня будуць разыграны медалі ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі са становішча стоячы, у стральбе з малакалібернай вінтоўкі з трох палажэнняў, а таксама ў стральбе з пнеўматычнага і малакаліберная пісталетаў. Ва ўсіх дысцыплінах пераможцы будуць вызначаны як у асабістых, так і ў камандных заліках.

Раней, у першы дзень спаборніцтваў, былі разыграны медалі ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі ў міксце, беларуская пара Захар Сазонаў — Лізавета Цыдзік спынілася за крок ад подыума, заняўшы чацвёртае месца.

— Хваляванне — самае складанае, з чым нам трэба справіцца. Так што будзем працаваць над гэтым, над тэхнікай, паляпшацца. І на будучых стартах станем паказваць свой максімум, — распавёў журналістам Захар Сазонаў.

Чарговае «золата» нашай краіне прынеслі прадстаўнікі кулявой стральбы. Першая зборная Беларусі ў складзе Івана Казака, Уладзіслава Дземеша і Мікіты Каваленкі паказала найлепшы вынік у камандным турніры па стральбе з пнеўматычнага пісталета, набраўшы 1729 ачкоў. Адстаўшы ўсяго на тры балы, на другой пазіцыі размясціліся расійскія стралкі, «бронзу» заваявалі спартсмены з Узбекістана. Каманда «Беларусь-2», за якую выступалі Алег Голік, Юрый Краўцоў і Мікалай Якута, заняла 4-е месца. Такім чынам, Іван Казак стаў ужо трохразовым чэмпіёнам II Гульняў краін СНД — у актыве беларуса залатыя медалі ў асабістым заліку і ў спаборніцтвах змешаных пар.

Таксама ў другі дзень спаборніцтваў у спартыўна-стралковым комплексе імя Цімашэнкі дзяўчаты разыгрывалі медалі ў стральбе з пнеўматычнай вінтоўкі са становішча стоячы. У фінальную васьмёрку прабіліся трое прадстаўніц Беларусі, але ніводнай з іх не ўдалося дабрацца да тройкі. Лізавета Цыдзік паказала пяты вынік, Аліна Мазоўка стала сёмай, Дар'я Чупрыс — восьмай. Увесь п'едэстал у выніку занялі расіянкі: «золата» выйграла Айгуль Хабібуліна, «серабро» дасталася Віялеце Адзінаевай, «бронза» — у Анастасіі Мураўёвай.

— Рыхтавалася і настройвалася на фінал, таму атрымалася так, як і было задумана, — падзялілася з журналістамі пераможца Айгуль Хабібуліна. — Не думала пра тое, якое месца займу, проста працавала і ўсё. Барацьба была вельмі напружаная, бо ўсе мае саперніцы моцныя. Спраўляцца з хваляваннем мне дапамагалі настрой, думкі і дыханне. Гэта мой маленькі сакрэт. І мне здаецца, што ў кожнага спартсмена ёсць такія маленькія сакрэты, іх не раскрываюць. Нашы трэнеры выхоўваюць у нас мэтанакіраванасць, дысцыпліну, волю ў барацьбе. У Беларусі мне вельмі падабаецца: горад добры, людзі добразычлівыя.

— Прыехалі ў Беларусь упершыню, засталіся добрыя ўражанні, у вас прыгожая прырода, а арганізацыя мерапрыемстваў на найвышэйшым узроўні, — расказала прадстаўніца каманды па кулявой стральбе зборнай Казахстана Індзіра Шакен. — Мы прыехалі ў складзе шасці спартсменаў: тры дзяўчыны, тры хлопцы, тры трэнеры. У асноўным з поўдня Казахстана: з Алматы, Шымкента. Імкнёмся, вядома, да перамогі, але паколькі гэта першыя міжнародныя спаборніцтвы для нашых дзяцей, асаблівых чаканняў не было. Але для іх узроўню гэта добры вынік, мы задаволеныя. Канкурэнцыя сярод краін СНД высокая, таму для нас цікава паўдзельнічаць у міжнародных спаборніцтвах такога ўзроўню.

— Беларусь вельмі прыемна нас шакіруе, — падзяліўся ўражаннямі з журналістамі трэнер зборнай Таджыкістана па кулявой стральбе Аляксандр Лагуценка. — Адкрыццё было на найвышэйшым узроўні. Людзі цудоўныя, цір — выдатны. Дзяўчына наша ўжо адстралялася, чакалі, што пройдзе ў фінал, але, на жаль, не выйшла. Трошкі недацягнулі, хоць спрабавалі, змагаліся і ў прынцыпе былі гатовыя, каб трапіць у фінал. Тым не менш я рады за іншых спартсменаў, якія трапілі ў фінал і пазмагаліся за медалі. Беларусь выгадна адрозніваецца ад усіх нас. Усе, хто прыехаў сюды, вельмі рады. Хутчэй, вышэй, мацней — вось асноўныя якасці, якія я выхоўваю ў сваіх спартсменах. Бо спорт — гэта ў першую чаргу барацьба!

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ГРАЖДАНАМ ЗЕМЕЛЬНОГО УЧАСТКА ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ОДНОКВАРТИРНОГО ЖИЛОГО ДОМА

Организатор аукциона – **Ивенецкий поселковый исполнительный комитет Воложинского района Минской области**

№ п/п	Адрес, кадастровый номер земельного участка	Площадь земельного участка, га	Характеристика инженерных коммуникаций	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток 20 % (бел. руб.)	Затраты на организацию и проведение аукциона (бел. руб.)
1	**г. п. Ивенец, ул. Полевая, 9, кадастровый номер 622055400050000013**	0,0778	Сети электроснабжения, газоснабжения, водоснабжения, подъездные пути	7000,00	1400,00	111,00 + расходы на размещение информации в СМИ

Аукцион состоится 8 сентября 2023 года в 11.00 по адресу: Минская область, Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Заявление на участие в аукционе и необходимые документы принимаются **до 6 сентября 2023 (включительно) до 17.00** по адресу: г. п. Ивенец, площадь Свободы, д. 2, кабинет № 7 управляющего делами исполкома. Время работы: понедельник–пятница с 8.00 до 17.00, перерыв с 13.00 до 14.00. Вся информация размещена на сайте Воложинского райисполкома: www.volozhin.gov.by.

Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории Республики Беларусь, в соответствии с законодательными актами Республики Беларусь.

Задаток в размере 20 % от начальной цены участка перечисляется на расчетный счет госказначейства: BY27AKKBB36006140205080000000 в ГУ МФ РБ по Минской области ОАО АСБ «Беларусбанк» г. Минск, AKBBBY2X, УНП 600037277, Ивенецкий поселковый исполнительный комитет, код платежа 04901.

Для участия в аукционе организатору аукциона в срок, установленный в информационном сообщении о проведении аукциона, физические лица либо их представители представляют:

заявление на участие в аукционе по утвержденной форме (представителями граждан – нотариально удостоверенная доверенность);

квитанцию об оплате задатка (оригинал).

При подаче заявления на участие в аукционе физические лица (представители физических лиц) предъявляют оригинал документа, удостоверяющего личность, и представляют его **копию.**

Победитель аукциона обязан в десятидневный срок со дня утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации и объявления в газету.

222370, Ивенецкий поселковый исполнительный комитет, Минская область, Воложинский район, г. п. Ивенец, пл. Свободы, 2.

Контактный тел. (801772) 53367.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона, оператор ЭТП	ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by**

Продавец	ООО «Санди Бич», г. Минск, ул. Ольшевского, д. 10, комн. 47	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
957	1. Расчетный узел контрольно-кассовой системы на одного кассира – 2 шт. 2. Стеллаж-нержавейка	798,35
расположенный по адресу: г. Минск, ул. Прушинских, 68		

Продавец	ООО «Тремля», Минская область, г. Минск, ул. Есенина, д. 67	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
958	Имущество – 32 наименования (с полным списком имущества можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by**)	2 636,61
расположенный по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 15		

Продавец	ЗАО «Продвильнюс» Минская область, Минский р-н, с/с Хатежинский, аг. Хатежино, ул. Центральная, д. 18Б, корп. 1	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
973	Имущество – 65 наименований (с полным списком имущества можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by**)	31 516,54
расположенный по адресу: г. Минск, ул. Свердлова, 15		

Продавец	ООО «ПровиантГрупп», Минская обл., Минский р-н, с/с Хатежинский, аг. Хатежино, ул. Центральная, д. 18Б, корп. 1	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
974	Имущество – 33 наименования (с полным списком имущества можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by**)	10 549,07
расположенный по адресу: д. Домашаны, Смолевичский р-н, Склад 8		

Продавец	ООО «Девибел», Минская область, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 10, комн. 232А	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
975	Имущество – 24 наименования (с полным списком имущества можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by**)	20 215,76
расположенный по адресу: д. Домашаны, Смолевичский р-н, Склад 4		

Продавец	ООО «Клайра», Минская область, г. Минск, ул. Берута, д. 11, пом. 1	
Предмет электронных торгов:		
Лот	Наименование (назначение), инвентарный номер	Начальная цена, без НДС (бел. руб.)
976	Имущество – 13 наименований (с полным списком имущества можно ознакомиться на торговой площадке: **www.torgi24.by**)	3 135,60
расположенный по адресу: д. Домашаны, Смолевичский р-н, Склад 8		

Размер шага составляет **5 %** от начальной цены лота

Задаток 10 % от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600001000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней после электронных торгов

Условия оплаты предмета электронных торгов

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **5 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – **не более 3 000,00 бел. руб.**

Дата и время начала торгов: 23.08.2023 в 09.00.
Дата и время окончания торгов: 23.08.2023 в 16.00

Для участия в торгах необходимо подать заявку и пройти регистрация в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **08.08.2023 по 21.08.2023** с 9.00 до 17.00

Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.
E-mail: info@torgi24.by

РУП «ТОРГОВЫЙ ДОМ «ВОСТОЧНЫЙ»

извещает
о проведении 22.08.2023 открытого аукциона
по продаже недвижимого имущества

Лот № 1. Объект недвижимого имущества в составе:
1) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42706 общей площадью 1 497,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: клуб-столовая. Составные части и принадлежности: блочный подвал, бетонное овощехранилище, асфальтобетонное покрытие, цементно-бетонные дорожки, ограждение.
2) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78086 общей площадью 42,2 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/10, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: трансформаторная подстанция. Составные части и принадлежности: отсутствуют.
3) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42710 общей площадью 225,5 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/3, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.
4) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42708 общей площадью 225,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/2, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.
5) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-42709 общей площадью 224,9 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/5, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: спальный корпус. Составные части и принадлежности: четыре террасы на деревянных сваях.
6) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78084 общей площадью 107,3 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/8, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад. Составные части и принадлежности: отсутствуют.
7) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78085 общей площадью 105,6 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/9, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное для лечебно-профилактических и санаторно-курортных целей; наименование: медицинский корпус. Составные части и принадлежности: две кирпичные пристройки.
8) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78090 общей площадью 15,8 кв. м, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, вблизи д. Удранка. Назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание сторожки. Составные части и принадлежности: отсутствуют.
9) Капитальное строение с инвентарным номером 630/С-78089, расположенное по адресу: Минская обл., Молодечненский р-н, Радошковичский с/с, 28/2, вблизи д. Удранка. Назначение: сооружение специализированное водохозяйственного назначения; наименование: водонапорная башня. Составные части и принадлежности: здания, сооружения и оборудование согласно технического паспорта № б/н от 20.01.2017 года, составленного по состоянию на 04.01.2017 года.
Капитальные строения расположены на земельном участке с кадастровым номером 623875700099000001 площадью 6,5437 га (право постоянного пользования).

Начальная цена продажи –
432 600,00 бел. рублей (без учета НДС).
Задаток – 43 260,00 бел. рублей (без учета НДС).
Шаг аукциона – 5 %.

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если заявление на участие в аукционе подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов (далее – Претендент на покупку), не позднее 3 (трех) рабочих дней со дня проведения аукциона на основании счета-фактуры возмещает Организатору затраты на организацию.
2. Срок подписания договора купли-продажи предмета аукциона не может превышать 15 (пятнадцать) рабочих дней со дня проведения аукциона.
3. Срок оплаты предмета аукциона должен составлять не более 3 (трех) рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для победителя аукциона. Организация и проведение аукциона осуществляются в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.
5. Порядок проведения аукциона, в том числе об оформлении участия в аукционе, указан на сайте konfiskat.by.

Аукцион состоится 22.08.2023 в 15.00
по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, актовый зал

Заявление на участие с приложением необходимых документов, в том числе документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) **с отметкой банка**, принимаются по адресу: г. Минск, ул. Уручская, 27, в рабочие дни: пн. – чт. – с 08.30 до 13.00, с 14.00 до 17.30, пт. – с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 16.15.
Окончание приема заявлений – 18.08.2023 в 15.00.
Задаток перечисляется на расчетный банковский счет Организатора аукциона: р/с BY53 AKBB 3012 0134 7111 1530 0000, БИК AKBBBY2X, ОАО «АСБ Беларусбанк» ЦБУ № 514, г. Минск, ул. Сурганова, 47а, получатель – РУП «Торговый дом «Восточный», УНП 101127633, ОКПО 37411910.
Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже капитального строения (изолированного помещения), **Лот № 1,** проводимом **22 августа 2023.**
Сведения о Заказчике аукциона: ОАО «Алеся», УНП 100619249, ОКПО 05543030. 220123, г. Минск, ул. Старовиленская, 131, +375 17 270 39 10, +375 17 270 15 13.
Лот может быть снят с аукциона Организатором в любое время, но не позднее чем за 5 (пять) календарных дней до наступления даты проведения аукциона.

Контакты организатора аукциона:
+375 44 763 62 63; +375 17 266 53 13 (приемная)

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТРЕТЬИХ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ № 2023.Б.002.00072

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга»
извещает о проведении третьих повторных электронных торгов по продаже имущества,
принадлежащего обществу с ограниченной ответственностью «Рубовский доломитовый карьер», УНП 391818611,
в отношении которого открыто производство по делу об экономической несостоятельности (банкротстве) № 152Б22130
в экономическом суде Витебской области.

Номер лота, вид выставляемого на третьи повторные электронные торги имущества:

Лот № 1. Недвижимое имущество.
Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения.
Кап. строение с инв. № 200/С-75167 площадью 2440,7 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18, наименование – здание АВИА-ТЭЧ № 219, назначение – здание специализированное иного назначения, составные части и принадлежности: крыльца, проезжая часть: участок № 1, участок № 2, участок № 3, водопровод ввода, канализационная сеть, находящееся на зем. участке с кадастровым № 221200000001001042 площадью 0,9429 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Журжевская, 18 (право постоянного пользования), целевое назначение зем.участка: зем. участок для содержания и обслуживания зданий и сооружений производственного назначения.
Начальная цена: 23 630,00 бел. руб. без НДС.
Минимальная цена: 11 815,00 бел. руб. без НДС.
Лот № 2. Недвижимое имущество.
Информация о предмете торгов, в т. ч. место нахождения.
Кап. строение с инв. № 200/С-96175 площадью 1588,2 кв. м по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 25/31, наименование – силосный склад цеха № 2, назначение – сооружение специализированное складов, хранилищ; составные части и принадлежности: пристройка, навес, линия электропередачи, находящееся на зем. участке с кадастровым № 240155400001000020 площадью 41,4083 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 25 (право долевого постоянного пользования), целевое назначение зем. участка: зем. участок для строительства и обслуживания завода, вспомогательных зданий и сооружений.
Начальная цена: 11 800,00 бел. руб. без НДС.
Минимальная цена: 5 900,00 бел. руб. без НДС.
Условия третьих повторных электронных торгов: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета электронных торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан: в течение 5 дней со дня проведения электронных торгов возместить затраты за организацию и проведение торгов и оплатить услуги оператора ЭТП; возместить расходы Продавца на проведение независимой оценки имущества в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения электронных торгов; оплатить стоимость приобретенного имущества не позднее 30 календарных дней с даты подписания договора купли-продажи.
Размер шага составляет 5 процентов от начальной цены лота.
Имеющиеся обременения в отношении лота № 1: договор аренды сроком действия до 31.10.2023.
Дата и время начала и завершения третьих повторных электронных торгов: **23.08.2023 с 9.00 до 16.00.**
Электронные торги проводятся на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» по электронному адресу: http://etpvit.by.
Прием документов осуществляется на ЭТП по электронному адресу: http://etpvit.by **по 16.00 22.08.2023.**
Для участия в третьих повторных электронных торгах на ЭТП по электронному адресу: http://etpvit.by необходимо подать заявку на участие в электронных торгах и пройти аккредитацию в качестве участника электронных торгов, а также перечислить задаток в срок **до 16.00 22.08.2023.**
Задаток по лоту № 1 в сумме **2363,00** (две тысячи триста шестьдесят три рубля 00 копеек) бел. руб., **по лоту № 2 – 590,00** (пятьсот девяносто рублей 00 копеек) бел. руб. должен быть зачислен на счет ККУП «Витебский областной центр маркетинга», УНП 390477566, р/с BY93MTBK30120001093300066782 в ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, код операции 40901.
Победителем электронных торгов признается участник, предложивший максимальную цену за лот.
Справочная информация:
Конт. тел. антикризисного управляющего: +375 (17) 241-87-66
Конт. тел. для осмотра объектов +375 29 5100763.
Конт. тел. лица, организующего торги на основании договора поручения: 8 (0212) 24-63-12, 8 (029) 510-07-63.
Дата, время и адрес доступа (ознакомления) с предметом электронных торгов: в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Организатором торгов по месту нахождения имущества.
Затраты на организацию и проведение электронных торгов определяются согласно сметы затрат, затраты на обслуживание ЭТП определяются согласно прейскуранта ЭТП. Ознакомление с затратами на организацию и проведение электронных торгов производится на http://etpvit.by до начала торгов.
Возмещение затрат на организацию и проведение электронных торгов осуществляется в соответствии с законодательством.

ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества
ООО «Двери Оптом Запад» (УНП 190987110),
объявляет о проведении **18.08.2023 г.** с 9.00 до 16.00
публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by.**

З архіўных крыніц

«КУЛЯШОВУ — 60: «ПРОСІМ ВАШАГА ДАЗВОЛУ...»

Народны паэт Беларусі (калі быць больш дакладнымі — усё ж народны паэт БССР) Аркадзь Куляшоў пакінуў значны след у гісторыі беларускай літаратуры. Напісаў шмат цікавых твораў, праявіў сябе як сапраўдны грамадзянскі летапісец часу. І пры гэтым у большасці твораў здолеў абысціся без лішняга пустазвонства. У апошнія дзесяцігоддзі творчага лёсу выявіў сябе глыбокім філосафам, паэтам-мысляром...

І, зразумела, асоба паэта, яго юбілеі былі заўсёды ў полі зроку органаў партыі, кіраўніцтва рэспублікі. У Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь захоўваецца такі вось кароткі ліст старшыні пісьменніцкай арганізацыі Максіма Танка, адрасаваны Першаму сакратару ЦК КПБ Пятру Міронавічу Машэраву — ад 7 студзеня 1974 года: *«...Паважаны Пётр Міронавіч!*

6 лютага 1974 года спаўняецца 60 гадоў з дня нараджэння народнага паэта БССР, лаўрэата Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, аднаго з найбольш выдатных майстроў шматнацыянальнай савецкай літаратуры Куляшова Аркадзя Аляксандравіча.

Просім Вашага дазволу на правядзенне 5 лютага г.г. агульнагарадскога вечара, прысвечанага юбіляру.

З павагай

Старшыня Праўлення

СП БССР М. Танк».

...На той час ужо выйшлі дзясяткі паэтычных кніг А. Куляшова. З 1947 года Аркадзь Аляксандравіч заставаўся нязменным дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Паэт меў дзве Дзяржаўныя прэміі СССР (яшчэ Сталінскія!) — за паэму «Сцяг брыгады» (1946) і за паэму «Новае рэчышча» (1949 год). У 1970-м Куляшова адзначылі Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Янкі Купалы за пераклады вершаў і паэм М. Ю. Лермантава, «Энеіды» І. Катлярэўскага і «Спева аб Гаяванце» Г. Лангфела. У 1966—1967 гг. выйшаў чатырохтомны Збор твораў паэта. Маштаб зробленага Куляшовым уражваў.

Кіраўнік ЦК КПБ і фактычны кіраўнік рэспублікі накладвае рэзалюцыю: *«Тав. Кузьміну А. Т. Прашу ўнесці адпаведныя прапановы...»*

15 студзеня 1974 года намеснік загадчыка аддзела культуры ЦК Яўген Парватаў піша П. Машэраву дакладную запіску, кароткую, але дастаткова зразумелую і ясную. *«Саюз пісьменнікаў БССР увайшоў у ЦК КПБ з просьбай дазволіць правядзенне агульнагарадскога ўрачыстага вечара, прысвечанага 60-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі А. А. Куляшова.*

Правядзенне вечара вызначана на 5 лютага г.г. у памяшканні Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Мяркуецца, што вечар адкрые ўступным словам народны паэт Беларусі М. Танк. Пасля гэтага зачытваецца прывітанне ЦК КПБ, Прэзідыума Вярхоўнага Савета і Савета Міністраў БССР юбіляру. З дакладам аб творчым шляху А. А. Куляшова выступіць, па яго просьбе, пісьменнік Бярозкін Р. С. Затым будуць прывітанні ад арганізацый і гасцей і слова ў адказ юбіляра. У заключэнне мастацкая частка (канцэрт).

Для падрыхтоўкі і правядзення юбілею створана камісія з прадстаўнікоў Саюза пісьменнікаў БССР, Міністэрства культуры рэспублікі і Мінскага гаркама КПБ пад старшынствам М. Танка.

Лічылі б магчымым пагадзіцца з вызначанымі мерапрыемствамі па 60-годдзю народнага паэта Беларусі А. А. Куляшова...»

На дакументе захаваўся і аўтограф Уладзіміра Гніламёдава. Ён на той час працаваў у ЦК КПБ: *«Урачысты вечар адбыўся 5 лютага 1974 г. Уладз. Гніламёдаў. 6. II. 1974.»*

Так, нічога звышдардынарнага ў гэтых архіўных матэрыялах няма. Але па-свойму яны з'яўляюцца красамоўным сведчаннем увагі ЦК партыі да постаці літаратара. І постаць жа якая была!.. Яго, Аркадзя Куляшова, вершы «Балада аб чатырох заложніках» (памятаеце: *«Перад бацькам Мінаем / Станьце, ўсе бацькі, на калені!»*), «Камсамольскі білет» *(«Цвёрда трымаўся юнак / на дапросе...»)*, «Мая Бесядзь», «На сотай вярсце», «Маё сэрца ў бары», і сёння — у свядомасці айчыннага чытача. Творы вялікага паэта — сапраўдны дзейсны арсенал духоўнага выхавання моладзі, чытача розных пакаленняў. У 2024 годзе, 6 лютага, спаўняецца 110 гадоў з дня нараджэння вялікага паэта сучаснасці Аркадзя Куляшова. Пэўна ж, юбілейныя ўрачыстасці ў знак памяці аб ім пройдуць па ўсёй нашай краіне...

Вячаслаў СЕЛЯМЕНЕЎ, Мікола БЕРЛЕЖ.

НА КОНКУРС АПАВЯДАННЯЎ

Ірына Тулупава больш за трыццаць гадоў працавала ў журналістыцы: на Беларускім радыё, у штотыднёвіку «ЛіМ» ды іншых выданнях. Аўтар празаічнай кнігі «Шчасце на парозе тваім», зборніка паэзіі «Чую і адгукаюся...».

У апавяданняў Ірыны Тулупавай простыя сюжэты. На іх багатае наша жыццё, але толькі пісьменнік убачыць у калейдаскопе малазначных, на першы погляд, падзей глыбокі сэнс. І ўдумлівы чытач зразумее аўтара. У амаль бытавой сустрэчы жанчын каля варот гарадскога парку адлюстроўваецца сумны парадокс нашага часу: мабільныя тэлефоны ды іншыя тэхнічныя прылады, зробленыя быццам бы для камунікацыі, насамрэч прыводзяць да раз'яднання людзей, адзінота робіцца з'явай будзённай, і самае каштоўнае сёння — гэта тыя самыя «простыя чалавечыя зносіны», аб якіх разважае гераіня апавядання.

Алена БРАВА.

Ірына ТУЛУПАВА

НЕДАХОП ЧАЛАВЕЧЫХ ЗНОСІН, АЛЬБО ВЕК ЖЫВІ, ВЕК ВУЧЫСЯ

— Вы на прагулку ці з яе?

Незнаёмая жанчына гадоў пад восемдзясят не проста спынілася побач, але і быццам прапаноўвала сяброўства. Толькі па той прыкмеце, што ў Ніны, як і ў яе, у руках былі палкі для скандынаўскай хадзьбы. Адзін спартсмен заўсёды зразумее другога. Няхай сабе спорт і непрафесійны. І нават не добраахвотны, а хутчэй вымушаны. Таму што за палкі сталы чалавек бярэцца часцей ад безвыходнасці — калі свае ногі пачынаюць падводзіць. Ці сустаўны рэўматызм нагадае пра сябе рэзкім болем, ці «галёнкаступ» скасабочыць паходку — справа не ў гэтым. А ў тым, што хочаш не хочаш, а станеш шукаць выратаванне ад часовай (ці часовай?) немачы.

Жанчына нагадвала сабою адыходзячую эпоху: з-пад фетравага капелюша вытыркаліся нечасаныя ўскудлачаныя валасы, пашарпаная «касуха» яўна пазычаная з чужога пляча, стаптаныя чаравікі з вялікай натугай можна было б назваць абуткам. І толькі вочы выпраменьвалі, здаецца, нічым не абгрунтаваныя радасць ды весялосць.

Маладзейшая за бабульку гадоў на дваццаць Ніна, між тым, таксама мусіла набыць сабе ў найбліжэйшай краме скандынаўскіх «памагатых». Балазе жыла побач з гарадскім паркам, дзе пралажылі сцяжыну здароўя. Па ёй штодня тупалі бадзёрыя пенсіянеры, хто па два кругі, хто па тры. Іншыя спыняліся каля трэнажораў — установленых тут шведскіх сценак, турнікоў, лавачак. Падцягваліся, прысядалі, падскоквалі. Усе, як маглі, распрацоўвалі сваё натомленае фізічнае цела. Глыталі свежае паветра, назапашвалі разам з дзённым сонейкам вітамін D, усміхаліся жыццю. А яно дарыла ім адзін за адным чарговы клапатлівы дзень, дабаўляла праблем і быццам забірала ўсе верагодныя магчымасці іх пераадолення. Выкручвайцеся як хочаце! Трэніруйце дух!

Дух! Што сталася з ім праз гады? Які ён быў у юнацтве? Цяпер, калі бабулька збянтэжыла раптоўным пытаннем, Ніна якраз выпадкова сустрэлася са сваёй аднакласніцай. Яны і стаялі ўдзвюх, абмяркоўвалі, ці варта праз сорак гадоў пасля школы згадваць былое. І ці варта збірацца, каб убачыць сваіх аднакласнікаў, многія з якіх цяпер ужо на заслужаным адпачынку? Сустрэліся каля дому, у якім жылі са школьных гадоў, у двары, з якога якраз быў выхад да сцяжыны здароўя. Тут і гукнула Ніну незнаёмая жанчына. Пэўна, інтуітыўна адчуўшы міжвольную радасць, якая праскочыла паміж аднакласніцамі. Відаць, захацела падтрымаць лёгкі зычлівы настрой.

Бабулька, якая трымала ў руках палкі, накіроўвалася напрасткі ў парк. Як добрую знаёмую, на якую ў яе было больш правоў цяпер (іх аб'ядноўвала аздараўленчая хадзьба), гукнула Ніну:

— А чаму мяне не паклікалі? Заўтра каб абавязкова перад праменадам стукнулі мне ў дзверы! Альбо па лбе. Вось так! — І яна падняла невялічкі, зморшчаны, разбіты падагрою кулачок да сваёй галавы. — Разам пойдзем!

— Слухаюся! — узяўшы «пад казырок», Ніна падтрымала жартаўлівы тон.

І бабулька, раскляняўшыся, імкліва развярнулася ды пайшла далей, яўна задаволеная сабою.

Аднакласніца праглынула дыялог моўчкі. І зусім нічога не зразумела, калі Ніна, вярнуўшыся да папярэдняй гаворкі, растлумачыла:

— Я яе не ведаю, першы раз бачу.

— А чаму ж паабяцала паклікаць?

— Ні ёй, ні мне гэта не трэба. Але паглядзі, якая яна ўся сагнутая. Палкі ёй дапамагаюць выжываць, хоць трохі, ды рухацца. І яна цешыцца тым, што можа вось так проста выйсці на двор, пагаманіць, зацікавіць ці ашаламіць незнаёмцаў. Па-юначы незласліва пахуліганіць.

Сама сабою далейшая гутарка аднакласніц пайшла пра недахоп простых чалавечых зносін. Пра тое, што асабліва бракуе іх людзям пажылым, хто застаецца адзін, якім і хацелася б пагаманіць, пажартаваць, ды няма з кім. Вось і ідуць пенсіянеры ў гурткі па інтарэсах, нават у грамадскім транспарце гамоняць з незнаёмцамі, адцягваюць увагу дактароў сваімі доўгімі размовамі.

— Добры дзень! — Ніна зноў мусіла абярнуцца на голас за спінаю. На гэты раз ён падаўся знаёмым.

Маладая жанчына, дужа заклапочаная, відаць, некуды спяшаючыся, прайшла і не прыпынілася. Калі б не гэтае вітанне, то Ніна і не заўважыла б, што нехта прайшоў міма.

— Добрага дня і вам! — кінула ёй наўздагон Ніна. Прыемна, што ўсё-ткі маладзіца абазначыла сябе. Не прайшла моўчкі, як сыч.

Аднакласніца, здзівіўшыся камунікабельнасці Ніны (гэта ж трэба: ніхто яе не абмінае), чакала тлумачэнняў.

Тая толькі паціснула плячыма: маўляў, сама нічога не разумею, відаць, дзень сёння такі.

— А... Гэтую жанчыну я ведаю! — узрадаваўшыся здагадцы, трыумфальна дадала: — Гэта манікюрша!

Сказала — і самой зрабілася няёмка. Але слова вылецела, не зловіш. Можна ж было назваць жанчыну інакш: «майстар па манікюры» альбо «супрацоўніца салона прыгажосці». А вось так... Кінуць чалавеку, які табе сваёю працаю не адзін раз узнімаў настрой, пагардлівае «манікюрша»... Як яна магла? Хоць прабачэння прасі...

Радасць ад сустрэчы з аднакласніцай, з незнаёмай аматаркай скандынаўскай хадзьбы некуды знікла разам з маладзіцай, якая, падобна, спазнялася да свайго кліента.

Хто вінаваты? Ніна сама. Ёй і выпраўляць.

Астатак дня прайшоў у пакутлівым роздуме і самаганьбаванні. Разваг пра тое, ці чула маладзіца гэтае непрыгожае слова ў яе адрас, нават не ўзнікала. Сам факт яго існавання ў свядомасці — як яно магло туды трапіць? — не даваў душы супакоіцца. Калі доўга жывеш адна, больш прывыкаеш да ўнутранага маналогу і частку слоў проста ўпускаеш, бо сабе многае тлумачыць не трэба. А навакольныя могуць зусім не так усё зразумець...

Назаўтра раніцай, узяўшы палкі і апрануўшы зручны фланелевы касцюм, Ніна выйшла з пад'езда і пакрочыла ў парк. На тым самым месцы, дзе ўчора гаманіла з аднакласніцай, прыпынілася. І змяніла свой намер. Парк пачакае... Салон прыгажосці хоць і размяшчаўся крыху наводдаль, але кірунак быў вызначаны дакладна.

— Тук-тук, можна? — Ніна ўсміхнулася сама сабе. «Ці не па лбе? Як там незнаёмка паказвала?» Прыадчыніла дзверы кабінета. Учарашняя маладзіца, майстар па манікюры, ветліва запрасіла зайсці.

— Што будзем рабіць сёння? — запыталася, прафесійна аглядаючы рукі Ніны, асабліва пазногці.

— Банальна, але... работу над памылкамі. Учора я назвала вас «манікюршай». Прашу прабачэння, мне вельмі няёмка.

— Няхай бы чортам называлі, абы ў балота не гналі.

Ніна падбадзёрылася.

— І добра, што вы не тоіце крыўды. Я таксама люблю беларускія прымаўкі. Яны выключаюць грубасць.

— А я і не пачула гэтай вашай крыўды. Маглі б не акцэнтаваць на тым увагу.

Маладосць усё прымае лёгка. У гэтым яе перавага.

— Не магла. Даўно не пачувала сябе нявыхаванай кабетай. Сэканоміла моўныя сродкі, замест двух слоў сказала адно, думала, хутчэй і прасцей выйдзе. А кантэкст атрымаўся крыўдны. Недахоп чалавечых зносін! Губляецца першароднае. Ветлівасць. Інтэлігентнасць. Спагада.

Уздыхнула вінавата. Трэба, відаць, каб зусім выправіць учарашні дзень, пазнаёміцца і з тою згорбленаю бабулькай гадоў пад восемдзясят... Скандынаўская хадзьба ў дапамогу!

Фестывалім

МУЗЫКА СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Мсціслаў зноў парадаваў гасціннасцю і храбрасцю верных рыцараў

Свята сярэднявечнай культуры «Рыцарскі фэст» — гэта міні-падарожжа на некалькі стагоддзяў назад. Яно да непазнавальнасці мяняе старажытны Мсціслаў, літаральна за ноч ператвараючы яго вуліцы ў гандлёвыя рады, інтэрактыўныя зоны, гульнявыя пляцоўкі, кавярні пад адкрытым небам. Але самыя цікавыя падзеі адбываюцца менавіта на Замкавай гары. Адтуль больш чым дзевяць стагоддзяў таму пачалася слаўная гісторыя горада. Дзякуючы археолагам сёння там можна ўбачыць не толькі рыцарскія баі, а і кавалачак аўтэнтычнай даўніны — праз раскоп XII стагоддзя. Мсціслаўская Замкавая гара — гісторыка-археалагічны помнік, музей пад адкрытым небам.

Рыцарскае свята традыцыйна пачалося на плошчы Пятра Мсціслаўца і адтуль пацякло людской плынню па фестывальных вуліцах на Замкавую гару. Акрамя дэлегацый з раёнаў Магілёўскай вобласці, якія прыехалі на рыцарскае свята, прыбылі госці з расійскіх Смаленска і Чалябінскай вобласці. У складзе смаленскай дэлегацыі прыехалі прадстаўнікі рэдакцыі гісторыка-літаратурнага выдання «Странник» і майстры пасёлка Гнёздава.

Цэнтрам сярэднявечнай культуры Мсціслаў стаў сёлета ў 15-ы раз. Прывітальны адрас ад старшыні Магілёўскага аблвыканкама Анатоля Ісачанкі ўдзельнікам і гасцям зачытаў начальнік упраўлення культуры Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр Жыгун. Кіраўнік вобласці адзначыў, што праект, які стартаваў у 2007 годзе, хутка стаў візітоўкай раёна і яркай культурнай падзеяй нашай краіны. Адкрыў свята і запрасіў паглыбіцца ў гісторыю мсціслаўскай даўніны старшыня Мсціслаўскага райвыканкама Дзмітрый Пімашэнка.

Старажытны горад вядомы сваімі непаўторнымі помнікамі архітэктуры — старадаўнімі культавымі будынкамі. Нашы продкі мелі гарачую веру і яна ратавала іх у паядынках. Сваё бласлаўленне на правядзенне свята далі благачынны Мсціслаўскай акругі, настаяцель кафедральнага сабора Аляксандра Неўскага айцец Вячаслаў і ксёндз каталіцкага прыхода Унебаўзяцця Найсвяцейшай Дзевы Марыі Павел. У гонар адкрыцця рыцарскіх турніраў па старадаўняй традыцыі быў перасечаны канат. Гэта зрабіў камандор «Ордэна Паўночнага Храма».

Тактычныя бугурты, турніры, манеўры, паказальныя выступленні коннікаў і шмат іншага — гэта тое, дзеля чаго сюды едуць прыхільнікі рыцарскай эпохі. На гэты раз, акрамя традыцыйнай праграмы мерапрыемстваў, наведвальнікі ўбачылі рэканструяваныя эпізоды ранняга Сярэднявечча. Маляўнічымі і захапляльнымі былі паказальныя выступленні коннікаў клуба гістарычнай рэканструкцыі «Залатая шпора», тэатралізаваны штурм замка, трукавае шоу гістарычнага клуба «Шатландская пяхота», канцэрт фолк-гуртоў «Стокс», «Хмельны вір», «Адамант», KaS, вогненнае шоу. Рыцары скаралі дам сваёй мужнасцю і вытрымкай. Нягледзячы на спякоту дэманстравалі цуды вынослівасці і адвагі.

Вядома, што старажытны Мсціслаў жыў не толькі рыцарскімі паходамі і паядынкамі. Каб больш дакладна праілюстраваць тую эпоху, арганізацыі, прадпрыемствы і ўстановы Мсціслаўскага раёна звярнуліся да каранёў сваіх прафесій і сталі старонкамі жывой гісторыі. Мсціслаўскі ўчастак паштовай сувязі побач са сваёй палаткай арганізаваў невялічкую гістарычную экспазіцыю з паштовымі фотакарткамі, сумкай паштальёна, копіямі газет XIX стагоддзя і сургучніцай. Начальнік Мсціслаўскага ўчастка паштовай сувязі Галіна Заянчкоўская прызналася, што ў іх калектыве працуюць выключна прафесіяналы, стаж работы якіх вымяраецца дзясяткамі гадоў. Дарэчы, начальніца сама 30 гадоў працуе на пошце.

«Звязда» скарысталася магчымасцю нагадаць пра сябе на фэсце і ўручыць падарунак ганаровану падпісчыку. Ім стала інструктар па падпісцы Ларыса Анатолеўна Целяпнёва, якая і атрымала ад выдання брэндавую футболку. Прызналася, што ўлюбілася ў газету з першага дня работы, а працуе ўжо даўно. Радасна было даведацца: у другім паўгоддзі «Звязда» не страціла на Мсціслаўшчыне ніводнага падпісчыка.

На фэсце штодзённае выданне на роднай мове знайшло сабе новых сяброў. Аляксандр, які працуе ў мясцовай ПМК-94, — адзін з іх. Ён яшчэ і выдатны рыбак. На фестывальнай вуліцы запякаў 16-кілаграмовага карпа. Вылавіў яго на адным з мсціслаўскіх азёраў. І гэты быў у яго яшчэ не самы вялікі.

А раённыя энергетыкі скарысталіся магчымасцю запрасіць гасцей фэсту ў віртуальную рэальнасць, каб пагутарыць на тэму бяспекі.

Юлія і Аляксей з Гомеля зачароўвалі пешаходаў старадаўнімі мелодыямі.

— Прыязджаем кожны год. Свята ўсё лепшае і лепшае, — прызналіся яны.

Прыгажуня ў сукенцы рыцарскіх часоў Анастасія з маленькай Сцешай прадстаўлялі мінскі клуб «Русіч». «Мы ўсёй сям'ёй удзельнічаем у клубе, разам са старэйшай дачкой і Сцешай, — удакладніла яна. — Сёлета ўвесь час падарожнічаем. А пачыналі летась». Анастасія прызналася, што хобі ўзнікла з любові да гісторыі, якой яна захаплялася і ў школе, і ў інстытуце. Па адукацыі яна юрыст.

На Замкавай гары рыцарскія паядынкі чаргаваліся з сярэднявечнымі канцэртамі. Гледачы былі ў захапленні ад відовішчных выступленняў вершнікаў конна-гістарычнага клуба «Залатая шпора». Не менш захапляльнымі былі прафесійныя баі тры на тры і адзін на адзін.

— Я калісьці заснаваў самы першы ў Беларусі ваенна-гістарычны клуб «Ордэн Сэрца Дракона», — расказвае Дзмітрый Нясцюк, які штогод прыязджае з Расіі. — І ўжо шмат гадоў вяду рыцарскія турніры на Замкавай гары. Ацэньваю фэст на дзесяць балаў з дзесяці. Сёлета вельмі спякотна. Баі ў такіх умовах — гэта пераднепрытомны стан, але хлопцы стараюцца біцца, за што ім трэба апладзіраваць кожную хвіліну. Спякотнае надвор'е на фэсце — звычайная з'ява, і мы спецыяльна рыхтуемся, каб вытрымаць і каб усё было прыгожа.

Рыцары добра валодаюць не толькі мячамі, але і лукамі. Так супала, што ў той час як у Магілёве спартсмены-лучнікі мераліся сіламі на стадыёне «Спартак» у рамках II Гульняў краін СНД, у Мсціславе сваё майстэрства дэманстравалі аматары.

— Некаторыя з нашых лучнікаў уваходзяць у склад нацзборных, — удакладніў каардынатар рыцарскіх клубаў Аляксандр Рак. — Калі ў іх ёсць вольны час, яны да нас далучаюцца.

У праграму сёлетняга Мсціслаўскага фэсту быў уключаны і вялікі блок гістарычнага баявога фехтавання. Хоць, як кажуць арганізатары, праграма ўстаялася, кожны раз мяняецца толькі тэматыка. Сёлета акцэнт рабіўся на конныя шоу.

У пераможцах «Рыцарскага фэсту — 23» — клубы «Веруш» і «Люцэрн»: яны выйгралі больш за ўсё намінацый. Барысаўскі клуб «Баявая спадчына» таксама атрымаў не адзін прыз, ёсць перамогі на рахунку зборнага клуба з Брэста і Баранавіч «Заходняя унія».

— Прызы ў асноўным даваліся за бугурты, бітвы троек і турнір «Гістарычны сярэднявечны бой», — рэзюмаваў Аляксандр Рак. — Найлепшым рыцарам фэсту стаў Яўген Аніскевіч, які адзначыўся ў гістарычным рыцарскім баі «Гарцукі». У якасці ўзнагарод рыцары атрымалі сякеры, алебарды, коп'і.

Дарэчы, прасачыць гісторыю рыцарскіх часоў можна будзе ўжо ў гэтыя выхадныя на «Нясвіжскай фартэцыі». Сярэднявеччу там прысвечаны невялікі блок.

Нэлі ЗІГУЛЯ,
г. Мсціслаў.

Фота Валерыя МАСКАЛЁВА.

Малая радзіма

Куды ідзе цягнік

Самы старажытны вакзал Беларусі стаў брэндавым святам аграгарадка Парэчча

Вакзал пабудаваны 161 год таму, калі праз населены пункт пачалася пракладка першай у Беларусі чыгункі. Па ёй праз Парэчча ў снежні 1862 года прайшоў першы цягнік. Парэцкі вакзал можна ўбачыць у кінафільмах «Зімародак», «Двое на востраве слёз», «Мяне завуць Арлекіна» і іншых. Вакзал захаваўся да сённяшняга часу, праўда, быў абноўлены дзесяць гадоў таму. Усё гэта стала падставай для таго, каб зладзіць тут брэндавае свята. Сёлета яно адбылося ў трэці раз.

Загадчыца Парэцкай бібліятэкі Алена САНЮК пазнаёміла з «чытаючым вагонам». Разам з паліцамі кніг устаноўлена фотазона з акном вагона. Таксама тут можна было пазнаёміцца з гісторыяй Парэцкага чыгуначнага вакзала. Як сведчаць дакументы, 161 год таму па тэрыторыі Беларусі прайшоў першы цягнік на ўчастку Гродна—Парэчча. Участак быў часткай магістралі Пецярбург—Варшава. А ў канцы XIX стагоддзя на станцыі Парэчча кожны дзень курсіравалі 12-14 цягнікоў, як пасажырскіх, так і таварных. Ужо тады станцыя была важным чыгуначным вузлом, праз які ішлі цягнікі ў Друскенікі, Вільнюс, Санкт-Пецярбург і Варшаву. У самім мястэчку былі пабудаваны дамы для персаналу, меліся свой чыгуначны клуб і крама. Дарэчы, у 70—80-я гады XX стагоддзя загадчыцай крамы была вядомая мясцовая прадпрымальніца Ганна Шандарук.

— З аграгарадком звязаны ўвесь мой лёс, — кажа яна. — Тут я пачынала сваю дзейнасць у чыгуначнай краме, але бачыла, што ў населеным пункце не хапае сучасных гандлёвых пунктаў. Узялася за справу, каб задаволіць попыт жыхароў і шматлікіх турыстаў. У сезон тут заўсёды шматлюдна, многія прыязджаюць адпачываць у мясцовы санаторый.

Дарэчы, мелі чыгуначнікі і свой аркестр, а на прывакзальнай плошчы ў выхадныя гудзеў кірмаш, куды з'язджаліся з усіх навакольных вёсак.

Менавіта прывакзальная плошча і стала месцам правядзення брэндавага свята. Як паведаміў **старшыня Парэцкага сельвыканкама Андрэй МАЦКЕВІЧ,** для аграгарадка вельмі важны такі ўнікальны статус. Дзе, як не тут, шырока адзначаць дзень нараджэння вакзала, які ўвасабляе і гісторыю, і сучаснасць. Да таго ж і нагода адпаведная — прафесійнае свята чыгуначнікаў, якое прыпадае на першую нядзелю жніўня.

— Жыццё многіх месцічаў звязанае з работай на чыгунцы. Падчас свята вакзала стала традыцыяй уручаць ім граматы і падарункі. Стаж некаторых дасягае сарака гадоў. І сёння наша станцыя не губляе свайго значэння. Чыгунка запатрабаваная рознымі катэгорыямі насельніцтва. Людзі ездзяць адсюль на работу, на вучобу ў Гродна, цягніком вяртаюцца назад. У летні сезон сюды ездзяць дачнікі, грыбнікі. Бываюць дні, калі цягніком прыбывае некалькі сотняў пасажыраў. Папулярнасць гэтага віду транспарту звязаная яшчэ і з невысокім коштам паездкі. Напрыклад, білет з Гродна да Парэчча каштуе 1 рубель 30 капеек, у той час як кошт маршруткі большы за 4 рублі.

Па словах старшыні сельвыканкама, паступалі заявы наконт змянення раскладу руху цягніка Гродна—Парэчча. Усе пытанні на сённяшні дзень урэгуляваныя. Для зручнасці пасажыраў быў арганізаваны дадатковы рэйс маршруткі ў дачныя кааператывы.

Удзельнікі свята наведалі і музей Беларускай чыгункі, які размясціўся ў будынку вакзала. Ствараўся ён агульнымі намаганнямі як навукоўцаў, так і саміх работнікаў чыгункі. Тут сабрана нямала спецыяльных прылад, якія сёння можна назваць экспанатамі.

Чэслаў Тамулевіч працуе на чыгунцы больш за 30 гадоў. Ён добра ведае ўсе ўстройствы, якія прадстаўлены ў музеі. Многімі карыстаўся і сам у пачатку сваёй работы.

— Вось гэтыя абцугі прызначаныя для пад'ёму шпал пры ўкладцы, а такой універсальнай лапатай карыстаўся памочнік машыніста для загрузкі вугалю ў топку. У нас захаваліся два паравозы, якія часам выкарыстоўваюць для здымак фільма, экскурсій, але яны не на ходу, бо для руху трэба заліваць амаль дзевяць тон вады, гэта даволі стратна, — расказвае чыгуначнік.

Ён звярнуў увагу на кляймо завода вядомых расійскіх прамыслоўцаў Дзямідавых. Менавіта яны пастаўлялі рэйкі для пракладкі першай чыгункі, якая прайшла праз Парэчча.

Неяк былі чуткі, што сюды з Гродна будзе хадзіць рэтрацягнік, і такая падзея сапраўды адбылася. На станцыю прыбыў сапраўдны старадаўні паравоз, адбылося тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам артыстаў, усе яны былі апранутыя ў адпаведныя эпосе касцюмы. Але ідэя не атрымала развіцця, хоць гэта было б цікава і турыстам, і мясцовым жыхарам. Затое каля вакзала ўстаноўлены макет рэтрапаравоза. Гэта стала фірменнай фотазонай аграгарадка.

Увогуле свята было даволі шматлюдным. Сюды цягніком прыехала нямала гродзенцаў. Сустрэча адбылася ўрачыстая, з удзелам дзіцячага аркестра VIP-BAND, лаўрэата шматлікіх рэспубліканскіх і міжнародных конкурсаў. У канцэртнай праграме выступілі салісты і музычныя калектывы аддзела культуры Гродзенскага райвыканкама. Цёпла прымалі жыхары і цыганскі тэатр «Рада».

Маргарыта УШКЕВІЧ,
фота аўтара.

Культурны код

ІДЭЯ — АД СВЕЖАГА ПАВЕТРА

Зняцца на аўтэнтычным фотафоне прапануюць гомельскія музейшчыкі

Прыклад таго, як культурная музейная прастора адгукаецца, напітваецца ідэямі выставачных праектаў ад гарадскога асяроддзя, паказаў Гомель. У Гомельскім палацава-паркавым ансамблі адкрылася выстаўка «Посцілка: дэкаратыўнае вымярэнне». Нарадзілася яна з цікавасці жыхароў горада да натуральнага і, можна сказаць, бытавога працэсу з жыцця экспанатаў музейных фондаў.

